Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

Літаратура і мастацтва

ISSN 0024-4686

№ 39 (4942) 29 верасня 2017 г.


Даследаваць тайнапіс 5

Нізка паэтычных колераў 6



У палоне тэатра 13

Сцежкі вандроўніка 15

Мастацтва з нажніцамі і паперай 16

«...НАМ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА»

Віктар Суглоб «Вясковы краявід». Пінскі раён.

Яна натхняла паэтаў і сто гадоў таму, і нават раней: усведамляючы, чым валодала яго радзіма і хто яе ўслаўляў, Мікола Гусоўскі напісаў сваю «Песню пра зубра»: людзі-волаты жылі на зямлі па-гаспадарску і ўмелі распараджацца ўсім багаццем, якім яна была адорана. У тым ліку і прыродным: таму вобразы звяроў, птушак, дрэў станавіліся сімваламі моцы, увасабляліся ў фальклоры і літаратурнай творчасці. Гэтае багацце зберагалі для нас продкі, яно і дагэтуль вярэдзіць уяўленне творцаў і ўражвае тых, хто імкнецца спасцігнуць Беларусь розную: прыродную і рукатворную, замкавую і вясковую, такую родную, але здольную здзіўляць тых, хто хоча яе разумець лепш. «Спадчына і прырода» — сёлета тэма Дзён еўрапейскай спадчыны, якія адзначаюцца і ў Беларусі.

Гэтай тэме прысвечана выстаўка ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», дзе прадстаўленыя творы айчынных фотамастакоў, якія натхняюцца прыроднай спадчынай Беларусі. Здымаюць у любую пару года, вартуюць добрыя кадры з рэдкімі птушкамі, якія вось-вось адарвуцца ад зямлі, знаходзяць таемныя сцежкі, нечаканыя ракурсы вясковых краявідаў, ды захапляюцца тады, калі храмы ды палацы ўпісаныя ў ландшафт так, нібыта ўвесь час там і стаялі. А хто ведае, напрыклад, як могуць зачараваць беларускія вадаспады?!.

Выстаўка прадстаўляе фотаздымкі Сяргея Плыткевіча, Валерыя Вядрэнкі, Альфрэда Мікуса, Віктара Суглоба, Кастуся Дробава, Віктара Малышчыца, Юрыя Жарко, Віталія Раковіча, Віктара Ведзеня, Міхаіла Кулеша, Дзмітрыя Осіпава, якія адлюстроўваюць прыгажосць і непаўторнасць беларускай прыроды. Кагосьці натхняюць жывёлы, кагосьці — азёры, нехта захапляецца рукатворнымі аб'ектамі ў прыродным атачэнні, нехта адлюстроўвае паэтычны настрой, якім дыхае прырода. Можа, таму кожны фотаздымак суправаджаецца вершамі, якія стварылі паэты Фёдар Баравы, Ірына Карнаухава, Марына Шапавалава, Святлана Рыжкова, Бажэна Мацюк, Віктар Кажура.

Дні еўрапейскай спадчыны штогод аб'ядноўваюць агульнай тэматыкай усе краіны, якія падпісалі Еўрапейскую культурную канвенцыю Савета Еўропы (1954 г.). Гэтая канвенцыя, як адзначана ў дакуменце, «стала першым міжнародным інструментам забеспячэння прававой асновы для абароны нематэрыяльнай культурнай спадчыны».

Менавіта ў верасні ўся Еўропа святкуе Дні еўрапейскай спадчыны: краіны выкарыстоўваюць гэтую нагоду для правядзення мерапрыемстваў і акцый, каб пазнаёміць сваіх грамадзян і гасцей з-за мяжы з аб'ектамі гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны, што знаходзяцца на іх тэрыторыі. У Беларусі Дні еўрапейскай спадчыны адзначаюцца з 1993 года — менавіта тады наша краіна далучылася да Еўрапейскай культурнай канвенцыі. Гэта выдатна, што ёсць дні і канкрэтныя нагоды, каб прыгледзецца да спадчыны, што засталася нам «ад прадзедаў спакон вякоў». Але вось бы яшчэ не забываць пра тое, што ў гэтую скарбонку пакладзе наша пакаленне: што захавае, створыць, пакіне?

Пункцірам

✔ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам XII Міжнароднага фестывалю Юрыя Башмета з нагоды адкрыцця музычнага форуму. «З кожным годам гэта свята класічнага мастацтва з удзелам музыкантаў сусветнага ўзроўню і маладых таленавітых выканаўцаў прымнажае традыцыі, выконваючы важную місію папулярызацыі лепшых узораў высокай культуры», — гаворыцца ў прывітанні. Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што сёлетні творчы форум зноў прыцягне ўвагу грамадскасці цікавымі праектамі, падорыць аматарам акадэмічнай музыкі яркія эмоцыі і будзе садзейнічаць умацаванню ўзаемаразумення і дружбы паміж народамі.

✔ Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў рашэнне савета фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы культуры і мастацтва аб вылучэнні больш як 598 тысяч рублёў са сродкаў фонду на завяршэнне ў 2017 годзе капітальнага рамонту былога дома купца Анташкевіча ў Магілёве, у якім размяшчаецца філіял Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі «Музей В. К. Бялыніцкага-Бірулі». Гэта першы ў нашай краіне мемарыяльны музей, прысвечаны жыццю і творчасці мастака. Пасля капрамонту тут размесціцца экспазіцыя больш як з 500 карцін.

✔ Міжнародныя XII Гродзенскія навуковыя чытанні, прысвечаныя 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, прайшлі ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я. Ф. Карскага. У мерапрыемстве бралі ўдзел навукоўцы і супрацоўнікі бібліятэчных устаноў з Беларусі і Літвы. Прагучалі даклады пра найбольш яркага прадстаўніка беларускай культуры — Францыска Скарыну і яго ролю ў станаўленні айчыннага кнігадрукавання.

✔ У Арт-цэнтры Марка Шагала адкрылася выстаўка архіўнай і дакументальнай фатаграфіі «Брынкуш і Шагал. Вольныя быць сабой», якая паяднала двух вялікіх мастакоў XX стагоддзя. Паводле дырэктара музея Шагала Ірыны Воранавай, невядома, ці былі знаёмыя мастак з Беларусі і скульптар з Румыніі. Яны маглі сустракацца ў Парыжы, дзе жылі ў адзін час, у Амерыцы, куды вымушаны былі з'ехаць, калі Францыю акупавалі фашысты. Такімі фактамі даследчыкі жыцця і творчасці мастакоў не валодаюць, але гэтыя імёны шмат што звязвае, найперш унёсак у авангарднае мастацтва мінулага стагоддзя.

✔ Ільняную карусель створаць удзельнікі аднайменнага фестывалю, які адбудзецца заўтра ў гарадскім пасёлку Карма на Гомельшчыне. Фэст разгорнецца ў цэнтральным парку гарпасёлка. Пачнецца свята «Ільняным парадам», дзе прадставяць разнастайныя вырабы з паўночнага шоўку. А потым удзельнікі свята прыступяць да стварэння ільняной каруселі — кампазіцыі з ручнікоў, ткаць якія будуць на працягу дня. Наведвальнікаў чакаюць разнастайныя тэматычныя пляцоўкі, а музей ільну прадставіць адмысловую экспазіцыю на вольным паветры.

✔ Паводле старшыні праўлення Беларускага грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы» Валерыі Кліцуновай, агратурызм Беларусі мае патрэбу ў неардынарных падыходах да арганізацыі адпачынку. У нашай краіне дзейнічае амаль 2,3 тыс. аграсядзіб, дзяржава аказвае ім падтрымку. Цяпер ёсць праблема ў стварэнні цікавага, яснага беларускага турпрадукту. Развіццю цікавых напрамкаў у гэтай сферы, на думку эксперта, пасадзейнічае конкурс на лепшы турыстычны маршрут у межах праграмы садзейнічання развіццю турызму *Belarus N*, якую рэалізуе вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта».

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Новы крок у супрацоўніцтве

Беларускія і кітайскія пісьменнікі абмеркавалі ў Мінску рэалізацыю сумесных праектаў

У склад кітайскай дэлегацыі ўвайшлі намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Шанхая Ван Вэй, галоўны рэдактар усекітайскага літаратурнага сайта Лю Юнху, пісьменнікі і празаікі. Сустрэча з кітайскімі калегамі — новы крок ва ўмацаванні творчага супрацоўніцтва літаратараў дзвюх краін і, безумоўна, будзе садзейнічаць больш глыбокаму знаёмству з культурамі народаў. Падчас круглага стала ў Доме літаратара беларускія пісьменнікі прадставілі пераклады кніг кітайскіх аўтараў, з якімі ўжо добра знаёмы беларускі чытач.

Дарэчы, перастварэннямі кітайскай літаратуры на беларускую мову актыўна займаюцца лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь паэт Мікалай Мятліцкі, паэты Таццяна Сівец, Валерыя Радунь, Юлія Алейчанка. Серыя кніг, прысвечаная кітайскай тэматыцы, выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда». Прэзентацыя выданняў была прадстаўлена кітайскім гасцям.

Паводле першага намесніка старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алены Стэльмах, былі закрануты і іншыя кірункі дзейнасці, якія збліжаюць літаратараў абедзвюх краін. У прыватнасці, гэта датычыць кніжных праектаў, якія ажыццяўляюць кітайскія студэнты з Беларускай акадэміі мастацтваў.

Госці з Кітая таксама наведалі Станькава, дзе ў філіяле Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны пазнаёміліся з гераічным мінулым беларускага народа. Вядома ж, уражаннямі пра паездку ў Беларусь кітайскія творцы падзеляцца са сваімі чытачамі.

Валянціна СТРОК

Мерыдыяны лучнасці

Пад нябёсамі творчасці

Серыю перакладаў з кітайскай паэзіі «Светлыя знакі. Паэты Кітая» прэзентавалі ў Мінску

У Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адбыўся літаратурна-мастацкі вечар з нагоды прэзентацыі серыі перакладаў кітайскай паэзіі «Светлыя знакі. Паэты Кітая». Серыя выходзіць на дзвюх мовах — беларускай і кітайскай. Яна заснаваная Выдавецкім домам «Звязда» ў 2014 годзе.

На сёння ў гэтай серыі выйшлі дзевяць кніг, у якіх прадстаўлена творчасць кітайскіх паэтаў розных эпох — з VII стагоддзя да цяперашняга часу: Ван Вэя, Ду Фу, Ай Цін, Лі Бо, Лі Хэ, Лі Цінчжаа, Ван Гочжэнь, Мэн Хаажань, Сюй Чжымо. У кнігах серыі таксама прадстаўлены пераклады вядомых беларускіх паэтаў — Рыгора Барадуліна, Яўгеніі Янішчыц, Міколы Мятліцкага ды іншых.

Дзякуючы серыі «Светлыя знакі. Паэты Кітая» беларусы маюць магчымасць на роднай мове далучыцца не толькі да паэзіі, але і да культуры, традыцый і багатай гісторыі Кітая. Падчас прэзентацыі наведвальнікі маглі адчуць гэтую краіну праз вобразы: галерэя прадставіла выстаўку рэпрадукцый твораў мастака Каміля Камала, які праілюстраваў шэраг кніг для серыі кітайскай паэзіі.

— На нашай імпрэзе сышліся слова, кніга і выяўленчае мастацтва, — падкрэсліў на прэзентацыі праекта намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алесь Карлюкевіч. — Калі гаварыць пра пераклады на беларускую мову, то большасць з іх зроблена альбо з падрадкоўніка, альбо з арыгінала. Серыя нарадзілася дзякуючы міністру інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілліі Ананіч. У час пэўных перамоў з кітайскім бокам, калі гаворка зайшла пра літаратуру, узнікла ідэя рэалізаваць праект. Калі серыя стала на ногі, мы зразумелі: трэба прыцягнуць да яе больш шырокую супольнасць. У гэтым паспрыяў Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Быў створаны міжнародны рэдакцыйны савет серыі. У яго ўваходзяць прадстаўнікі кітайскага гуманітарнага кірунку, у прыватнасці вядомы перакладчык, у тым ліку твораў беларускай літаратуры, Гаа Ман, добры партнёр Беларусі ў літаратурна-гуманітарных стасунках. Спадзяюся, што серыя будзе развівацца і паспрыяе вывучэнню як Беларусі ў Кітаі, так і Кітая ў Беларусі.

Дырэктар Інстытута Канфуцыя Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта з кітайскага боку Шы Лін.

У межах праграмы літаратурна-мастацкага вечара выступіў беларуска-кітайскі хор «Садружнасць» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Сваёй творчасцю падзяліліся беларускія пісьменнікі і паэты — перакладчыкі серыі, сярод якіх Навум Гальпяровіч, Таццяна Сівец, Рагнед Малахоўскі ды Мікола Мятліцкі.

— Я дакрануўся да кітайскай паэзіі выпадкова. Некалі Барыс Сачанка падарыў мне томік Ван Вэя. Ён прастаяў на паліцы да таго моманту, пакуль не ўзарваўся ў маёй душы такой прыемнай прыхільнасцю ў адносінах да Кітая, — прызнаўся Мікола Мятліцкі. — Гэта паэзія вялікага суровага рэалізму, вялікай сілы, сумлення. Гэта канстытуцыя духу. Некалькі год назад на свае плечы я ўсклаў вельмі адказную і пачэсную місію — пераклаў анталогію кітайскай паэзіі «Пад крыламі дракона. Сто паэтаў Кітая». Алесь Мікалаевіч падштурхнуў мяне на працяг гэтай вялікай і адказнай справы. Уся серыя «Светлыя знакі. Паэты Кітая» — вельмі праўдзівая кніга жыцця кітайскага народа. Паверце, дваццатае стагоддзе крывавым было не толькі на нашых абсягах, дзе прагрымелі дзве сусветныя вайны, — трагічным яно было і для лёсу кітайскага народа.

Зараз ідзе праца над дзясятай кнігай серыі «Светлыя знакі. Паэты Кітая», якую складуць вершы кітайскага паэта першай паловы дваццатага стагоддзя Вэн Ідо.

Вікторыя АСКЕРА

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

29 верасня — *у літаратурны клуб «Творчыя сустрэчы» пры публічнай бібліятэцы № 8 імя М. Багдановіча. Госць — паэтэса, празаік Наталля Саветная. Пачатак а 13-й гадзіне.*

2 кастрычніка — *на творчую імпрэзу «Мы яшчэ маладыя душой», прысвечаную Дню пажылых людзей, з удзелам пісьменнікаў сталічнага аддзялення СПБ у публічную бібліятэку № 10. Пачатак а 14-й гадзіне.*

3 кастрычніка — *на літаратурны вечар-прэзентацыю кніг беларускіх і замежных пісьменнікаў у Літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа. Пачатак а 17-й гадзіне.*

4 кастрычніка — *на свята дзіцячай кнігі з удзелам пісьменнікаў сталічнага аддзялення СПБ у публічную бібліятэку № 21. Пачатак а 12-й гадзіне.*

4 кастрычніка — *на літаратурны фестываль з удзелам пісьменнікаў Беларусі, блізкага і далёкага замежжа ў канцэртную залу касцёла Карла Барамеа (г. Пінск). Пачатак а 13.30.*

4 кастрычніка — *на канцэрт духоўнай музыкі і паэзіі ў межах Дзён праваслаўнай культуры ў дзіцячую бібліятэку № 15. Пачатак а 14-й гадзіне.*

4 кастрычніка — *у літаратурна-музычны салон Асацыяцыі інтэлектуальнай уласнасці «БелБрэнд» на паэтычныя чытанні з удзелам маладых паэтаў Беларусі, блізкага і далёкага замежжа ў канцэртную залу касцёла Карла Барамеа. Пачатак а 18.30.*

5 кастрычніка — *на літаратурна-песенны фестываль аўтарскай песні ў канцэртную залу касцёла Карла Барамеа з удзелам беларускіх і замежных паэтаў і бардаў. Пачатак а 10.30.*

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

29 верасня — *на творчую сустрэчу з паэтам Андрэем Мазько «Пакуль мы кахаем — жывём...» у Дом культуры г. Лунінца. Пачатак а 17-й гадзіне.*

Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

3 кастрычніка — *на творчы вечар кампазітара-песенніка Валерыя Кручкова «Гродна, ты — любоў мая, надзея і натхненне» ў Гарадскі цэнтр культуры (г. Гродна, вул. Дзяржынскага, 1), дзе прагучаць творы на вершы членаў Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ. Пачатак а 15-й гадзіне.*

Прэзентацыя

Прысвячэнне Мінску

У Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Я. Купалы адбылася прэзентацыя зборніка «Мінск — горад майго лёсу». Нагадаем, што выдавецтва «Чатыры чвэрці» ладзіла аднайменны конкурс, прысвечаны 950-годдзю Мінска. Пераможцы былі названыя сёлета, у лютым, падчас XXIV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, і вось нарэшце свет пабачыла кніга, у якой змешчаныя творы пераможцаў. Ацэньвала творы кампетэнтнае журы — прафесійныя літаратары, члены Саюза пісьменнікаў Беларусі.



Мерапрыемства распачалося пад музычнае суправаджэнне лаўрэата міжнародных конкурсаў Аляксандра Данілава. Дырэктар выдавецтва «Чатыры чвэрці» Ліліяна Анцух у прывітальным слове засяродзіла ўвагу на знакавых датах гэтага года: «Наша выдавецтва імкліва набліжаецца да свайго 25-годдзя. Гэта адна чвэрць стагоддзя прафесійнага шляху! Сёлета мы адзначаем важныя даты — 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, 950-годдзе Мінска. Да іх выдавецтва падрыхтавалася адказна: напярэдадні Дня горада свет пабачыла грунтоўнае выданне — «Мінск скрозь стагоддзі» і зборнік «Мінск — горад майго лёсу». Першае адлюстроўвае знакавыя вехі ў гісторыі і сучаснасці горада, дае магчымасць уявіць, якім насычаным было жыццё цяперашняй сталіцы. Панарама гісторыка-культурнай спадчыны, маляўнічыя краявіды Мінска, фрагменты са штодзённага жыцця мінчан і маштабныя з'явы ў грамадскім, культурным, сацыяльна-эканамічным развіцці, галінах спорту і турызму дапаўняюць аповед. Прыцягваюць увагу і рэдкія фатаграфіі, дакументы, рэпрадукцыі карцін вядомых беларускіх мастакоў, чыя творчасць працята любоўю да роднага Мінска».

Імпрэза ладзілася пад агульным дэвізам «Слова маладым!». І нездарма: у стварэнні кнігі ўзялі ўдзел не толькі дасведчаныя майстры, але і юныя таленты. Так, ілюстратыўнай часткай займаліся навучэнцы Мінскага мастацкага каледжа імя А. Глебава Дар'я Базарава і Настасся Рыжова, а таксама Мінскага дзяржаўнага архітэктурна-будаўнічага каледжа Аляксандр Слізуноў, Улада Ларкова, Барыс Міхалёў, Бажэна Шамко.

Павіншаваць пераможцаў конкурсу завітала першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах. Святлана Быкава, паэтэса, старшыня Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, падзялілася з прысутнымі сваёй гісторыяй стварэння твораў, прысвечаных Мінску, і прадэкламавала некаторыя з іх. Прагучалі вершы Максіма Кішчанкі, Глеба Ганчарова, Міхаіла Макрацова. Алег Елісеенкаў, беларускі кампазітар і спявак, выканаў песні на вершы Івана Юркіна, лаўрэата прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва, «Прыязджайце да нас у Беларусь» і «Край калины красной». А Паліна Данская, уладальніца Гран-пры фестывалю патрыятычнай песні Мінска, выступіла з кампазіцыяй «Мінск — сталіца Айчыны маёй» на верш Наталлі Краевай і Міколы Шабовіча.

Крысціна ТРОСКА

Фестываль

СПЕКТАКЛІ НІБЫТА МАЙСТАР-КЛАСЫ

Як расстаўлены акцэнты ў праграме «ТЭАРТа»?

Міжнародны форум тэатральнага мастацтва «ТЭАРТ» ужо не адзін год доўгачаканая падзея для беларускага гледача. Фестываль пачаўся 27 верасня знакамітай гогалеўскай «Жаніцьбай» у выкананні Ліепайскага тэатра.

На прэс-канферэнцыі, што папярэднічала адкрыццю, арганізатары адзначылі, што мэта, дзеля якой форум існаваў папярэднія гады, — паказаць беларусам якасны тэатр. Яна застаецца актуальнай і цяпер, але крыху зменіцца форма падачы тэатральнага матэрыялу.

— Сёлета колькасць спектакляў зменшылася, але змянілася падача, — расказала на прэс-канферэнцыі дырэктар Міжнароднага форуму тэатральнага мастацтва Анжаліка Крашэўская. — Усе пастаноўкі тэхнічна складаныя, з прафесійным складам артыстаў. Кожны спектакль — свайго роду майстар-клас. Што да беларускай праграмы, мы яе ўдасканалілі, каб яна магла канкурыраваць з серыяй замежных спектакляў. Адна з найважнейшых секцый форуму, на якую мы робім стаўку, — «Школа ТЭАРТа». Яна ўключае лекцыі, майстар-класы. Дарэчы, сёлета ў праграме з'явіўся яшчэ адзін кірунак — кіно. У кінатэатры «Масква» 26 верасня адбылася прэзентацыя фільма «Паліна, станцаваць сваё жыццё» з удзелам рэжысёра, французскага харэографа Анжэлена Прэльжакажа і выканаўцай галоўнай ролі. Гэта свайго роду творчая сустрэча гледача з маэстра.

Адукацыйная частка ў сукупнасці з практычнай дапамагае гледачу больш глыбока прасякнуцца тэатральнымі пастаноўкамі і да канца зразумець іх сэнс.

— «ТЭАРТ» — гэта не вузкая тусоўка, а пляцоўка для зносін гледачоў, рэжысёраў, артыстаў і лектараў, — падкрэсліла Анжаліка Крашэўская. — Фестываль — гэта не толькі спектаклі. Адукацыйная праграма скіраваная на тое, каб зацікавіць гледача, даць яму арыенціры і дапамагчы зразумець тэатр як від мастацтва. Тэатр павінен быць розным, але не пахабным. 75% пастановак у беларускіх тэатрах — гэта камедыі. Вядома, гэты жанр таксама павінен быць. Але што далей? Адчуванне такое, быццам усім хочацца толькі радавацца і весяліцца. Трэба выходзіць за рамкі, паказваць якаснае. Сёлета штосьці цікавае ў праграме для сябе знойдуць і прафесіяналы, і звычайныя глядачы. Мы пакажам пэўны зрэз разнажанравых пастановак розных школ.

Многія гледачы былі здзіўленыя фактам, што сёлета ў рэпертуары форуму адсутнічаюць спектаклі літоўскіх і польскіх тэатраў. Аднак арганізатары падкрэсліваюць, што праграма плануецца з пункту гледжання навізны і сусветнага прызнання і кожны сезон павінен запомніцца новымі героямі тэатральнай сцэны.

Вікторыя АСКЕРА

ЛіМ КАЛЯНДАР

70 гадоў таму (1947) быў створаны Гродзенскі абласны драматычны тэатр.

30 верасня — 125 гадоў з дня нараджэння Зоські Верас (сапр. Сівіцкая Людвіка Антонаўна, па мужы Войцік; 1892 — 1991), беларускай пісьменніцы, публіцыста, мемуарыста, выдаўца, грамадска-культурнага дзеяча.

30 верасня 75 гадоў споўніцца Васілю Несцярэнку, беларускаму жывапісцу.

30 верасня 70-годдзе адзначыць Віталь Дзенісенка, беларускі жывапісец, графік.

1 кастрычніка — 80 гадоў з дня нараджэння Івана Вашкевіча (1937 — 2011), беларускага акцёра, тэатральнага дзеяча, заслужанага работніка культуры Рэспублікі Беларусь.

1 кастрычніка 80-гадовы юбілей адзначыць Андрэй Мдзівані, беларускі кампазітар, педагог, народны артыст Беларусі.

1 кастрычніка 75 гадоў споўніцца Наталлі Парошынай, беларускай артыстцы балета, заслужанай артыстцы Рэспублікі Беларусь. З 1965 г. жыве ў Расіі.

2 кастрычніка 85-годдзе адзначыць Валянціна Антонава, беларуская спявачка, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь.

2 кастрычніка 75-гадовы юбілей адсвяткуе Уладзімір Іскрык, беларускі драматург, мастацтвазнаўца, педагог.

3 кастрычніка — 120 гадоў з дня нараджэння Міхася Дуброўскага (1897 — 1983), беларускага паэта, драматурга, перакладчыка.

3 кастрычніка — 95 гадоў з дня нараджэння Міхася Навумовіча (Наўмовіча) (1922 — 2004), грамадскага дзеяча беларускай эміграцыі, мастака, фізіятэрапеўта. Жыў у Францыі.

3 кастрычніка — 85 гадоў з дня нараджэння Васіля Сабалеўскага (1932 — 2000), беларускага жывапісца.

3 кастрычніка — 80 гадоў з дня нараджэння Яўгена Радкевіча (1937 — 1999), беларускага празаіка.

5 кастрычніка 60 гадоў спаўняецца Аляксандру Дзяшко, беларускаму жывапісцу.

5 кастрычніка — 50-годдзе адзначыць Сяргей Харэўскі, беларускі мастак, культуролаг, літаратар.

Дайджэст

• Супрацоўнікі Прэзідэнцкай бібліятэкі Беларусі склалі спіс з 10 беларускіх кніг, «абавязковых для чытання хоць бы адзін раз у жыцці». На першым месцы — кніга, якую прызналі самай уплывовай на развіццё беларусаў як нацыі — «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча. На другім радку рэйтынга — «Знак бяды» Васіля Быкава, адзначаны ў 1982 годзе найвышэйшай на той час узнагародай — Ленінскай прэміяй. «Бронзу» ўзяла аповесць Алеся Адамовіча «Карнікі», напісаная на дакументальным матэрыяле. Таксама ў спіс абавязковых увайшла «Палеская хроніка» Мележа, «Трывожнае шчасце» Шамякіна, верш Барадуліна «Трэба дома бываць часцей». Звярнулі ўвагу і на творчасць сучаснікаў: у рэйтынг трапілі кніга Арлова і Татарнікава «Айчына», «Сыны» Чаргінца, «Авантуры Пранціша Вырвіча» Рублеўскай і «Сад на капялюшыку каханай» Баравіковай.

• У Беларусі скончыўся I Мінскі міжнародны цыркавы фестываль, вынікі якога падвялі на гэтым тыдні. За ўзнагароды змагаліся артысты з 16 краін. Гран-пры артымаў калектыў Беларускага дзяржаўнага цырка, дзве залатыя ўзнагароды ўручаны акрабатам-вальціжорам з Расіі і камандзе артыстаў з КНДР. Срэбра ўручылі расійскім акрабатам і беларускім паветраным гімнастам на палотнах. Бронзавыя ўзнагароды таксама атрымалі в'етнамскі і аўстралійскі нумары, а атракцыён з нубійскімі львамі і бенгальскімі тыграмі з Егіпта адзначаны прызам глядацкіх сімпатый.

• У Віцебску з'явіцца новы трамвай з «Маршрутам ад Марка Шагала і Казіміра Малевіча». Ён выйдзе на лінію ў Віцебску ў межах Тыдня ўстойлівага развіцця. Шагал і Малевіч заклалі ў Віцебску традыцыі ствараць грамадска значныя аб'екты, якія ўплываюць на развіццё візуальнай культуры і стаўленне жыхароў да горада. Упершыню традыцыі былі рэалізаваныя ў Віцебску год таму: у новым рашэнні былі ўзноўленыя эскізы Малевіча і Когана на двух трамваях і адным тралейбусе. Праз малюнкі на транспарце гараджане змаглі засвоіць многія мастацкія паняцці. Асветніцкую місію вырашылі працягнуць і сёлета: у новай працы перададуць 17 прынцыпаў Устойлівага развіцця, прынятых ААН да 2030 года..

• Карыстальнікі найбуйнейшага міжнароднага партала для турыстаў *Trip-Advisor* вызначылі спіс лепшых музеяў свету. У пяць лепшых сусветных музеяў трапіў і Дзяржаўны Эрмітаж у Санкт-Пецярбургу. Пецярбургскі музей, дзе захоўваецца 2,7 млн экспанатаў, у рэйтынгу сайта — на пятым месцы, там — уся прыгажосць свету адразу і можна здзейсніць уяўнае падарожжа па месцах і эпохах. Першае месца ў сусветным рэйтынгу заняў нью-ёркскі Метраполітэн-музей, другое — Нацыянальны музей Другой сусветнай вайны ў Новым Арлеане. На трэцяе масца наведвальнікі паставілі музей парыжскі Арсе, на чацвёртае — Чыкагскі інстытут мастацтваў.

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Установа адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад (да 5 гадоў) прафесарска-выкладчыцкага складу (для тых, хто мае мінскую рэгістрацыю) з далейшым заключэннем кантракта ў выпадку выбрання на тэрмін, вызначаны Наймальнікам:

1	кафедра гісторыі і музыкальнай беларусістыкі	— старшы выкладчык (1,0 шт. адз.) — прафесар (1,0 шт. адз.)
2	кафедра аркестравага дырыжыравання і інструментоўкі	— дацэнт (1,0 шт. адз.)
3	кафедра канцэртмайстарскага майстэрства	— прафесар (1,0 шт. адз.)
4	кафедра драўляных духавых інструментаў	— старшы выкладчык (1,0 шт. адз.)
5	кафедра тэорыі музыкі	— дацэнт (1,0 шт. адз.)
6	кафедра медных духавых і ўдарных інструментаў	— прафесар (1,0 шт. адз.) — старшы выкладчык (1,0 шт. адз.)
7	кафедра опернай падрыхтоўкі і харэаграфіі	— старшы выкладчык (1,0 шт. адз.)

Фота Яўгена Пясецкага.

РАЗГАДКІ ПЕРШАДРУКАРА

шукалі падчас XIII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў

XIII Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні прайшлі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў межах кангрэса «500 гадоў беларускага кнігадрукавання».

ЧАС ДЛЯ АСОБЫ

На пленарным пасяджэнні намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і рухавік усіх юбілейных мерапрыемстваў Алесь Суша ў дакладзе адзначыў: усе беларусы ведаюць Скарыну, але ў кожнага Скарына свой. Гэта, вядома, Скарына-першадрукар, перакладчык і выдавец Бібліі (уласную друкарню Скарына займеў у Вільні, а ў Празе друкаваўся ў іншых, таму Скарына пражскага перыяду — гэта менавіта кнігавыдавец, а не друкар). Але ён таксама быў дзяржаўным ды рэлігійным дзеячам: у яго біяграфіі ёсць пасады епіскапскага сакратара, пісара, дарадцы вышэйшых дзяржаўных чыноў. Скарына — першы беларускі доктар навук (ён і сам гэта пастаянна падкрэсліваў), медык, прыдворны лекар (прычым пры некалькі дварах!). Ён лічыў першых асоб, што паказвае яго значнасць у тагачасным еўрапейскім грамадстве. Скарына — гэта і абазнаны батанік, садоўнік. Нарэшце, Скарына — першы беларускі паэт, аўтар вядомых сёння паэтычных радкоў. Скарына — першы вядомы нам ураджэнец Беларусі, які стаў паўнавартасным прадстаўніком эпохі Адраджэння. Як Леанарда да Вінчы, Скарына праявіў сябе ў розных сферах дзейнасці.

Асобе і дзейнасці Скарыны была прысвечаная адна з секцый кнігазнаўчых чытанняў. Гэтая секцыя цягнулася даўжэй за астатнія — да самага закрыцця кангрэса (і працягвалася б яшчэ, каб прадстаўнікі Нацыянальнай бібліятэкі не ахвяравалі б сваімі выступамі). Адкрыццяў на секцыі не прагучала, але іх і не чакалася: новыя факты і інтэрпрэтацыі гучалі ўвесь год, і кангрэс стаў добрым месцам, каб іх падсумаваць.

Разам з тэмамі біяграфіі і кніг Скарыны важкім кірункам становіцца даследаванне скарыназнаўства і біяграфіі скарыназнаўцаў. З дакладамі ў гэтым рэчышчы выступілі госці з Расіі: сямейная пара даследчыкаў з Інстытута славяназнаўства Расійскай акадэміі навук Юрый Лабынцаў і Ларыса Шчавінская зрабілі даклад пра польскае скарыназнаўства, дырэктар Музея кнігі Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі Джаміля Рамазанава расказала пра Скарыну ў працах Антаніны Зёрнавай — бадай самай аўтарытэтнай у свеце даследчыцы кірылічных старадрукаў. Выявілася, што ў А. Зёрнавай засталася неапублікаваная работа пра Скарыну, якая стала б наватарскай у савецкі час і значна раней дала б штуршок для даследавання Скарыны. Сярод іншага, даследчыца вывучала ініцыялы Скарыны, вылучыла сюжэты, якія на іх выяўленыя, і здолела прасачыць, як багата пераймалі Скарынавы ініцыялы ў наступныя дзесяцігоддзі і стагоддзі: і ў Вільні (Пётр Мсціславец), і ў Астрогу (мясцовыя друкары), і ў Магілёве (Спірыдон Собаль), і нават у Маскве (друкар першага расійскага буквара Васіль Бурцоў). Шрыфт пераймалі пратэстанты — Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, славенец Прымаж Трубар. У Расіі ж перайманне такога «манернага шрыфту» яшчэ доўга было немагчымае.

ЗНАКІ ДЛЯ РАСШЫФРОЎКІ

Са Скарыны ў кірылічным кнігадрукаванні пачаўся звычай абрамляць кананічны тэкст суправаджальнымі выдавецкімі тэкстамі — калафонам, які мы прызвычаіліся называць прадмовамі і пасляслоўямі, распавёў вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага гістарычнага музея Юрый Лаўрык. У яго дакладзе прагучала і тлумачэнне кур'ёзу, звязанага са Скарынавым Псалтыром. Справа ў тым, што тытульны ліст у Псалтыры аказаўся на адвароце. А на знешнім баку аркуша прадстаўлена гравюра з радаводам цара Давіда і подпісам пра спонсара Багдана Онкава, за чый кошт надрукаваная кніга. Верагодна, Скарына хацеў аздобіць тытульнік рамкай з віньеткамі, але не паспяваў. А без аздобы тытульны аркуш моцна прайграваў адвароту ў прыгажосці. Таму Скарына і яго памочнікі ў апошні момант вырашылі памяняць месцамі бакі аркуша.

А як інтэрпрэтаваць знакамітыя знакі са Скарынавых гравюр? Даследчык Алег Ліцкевіч прадставіў цікавую гіпотэзу: сонца і месяц — знак зацьмення, але таксама гэта сімвал сонечнага і месяцовага цыклаў, па якіх хрысціяне вылічваюць дзень Вялікадня. Табліца для вылічэнняў у часы Скарыны мела назву «скара», бо нагадвала краты для смажання мяса, якія таксама называліся «скарамі» ў беларусаў XVI стагоддзя. На думку Ліцкевіча, у гэтым сімвале Скарына зашыфраваў сваё прозвішча. Але на гэтым нечаканасці не заканчваюцца. Схематычная ромбападобная выява з крыжам — яшчэ адзін загадкавы сімвал Скарынавых гравюр — можа азначаць Скарынава імя па бацьку — Лукіч. Гэта выява, мяркуе Алег Ліцкевіч, насамрэч задыякальная выява галавы цяльца. А цялец — сімвал апостала Лукі. А трохкутнік з крыжам — знак ордэна францысканаў і знак святой Троіцы — мог быць зашыфраваным іменем першадрукара. Такім чынам, з таямнічых знакаў складаецца подпіс — «Францыск Лукіч Скарына».

МЕСЦЫ ДЛЯ СУСТРЭЧ

Не ўсе дакладчыкі здолелі паўдзельнічаць у канферэнцыі, але ўсе даклады можна прачытаць у двухтомным зборніку «Матэрыялы міжнароднага кангрэса "500 гадоў беларускага кнігадрукавання"», які выйшаў да адкрыцця канферэнцыі. Сярод тэматычных дакладаў цікава пазнаёміцца, напрыклад, з тэкстам экскурсавода Івана Сацукевіча пра вуліцы Францыска Скарыны ў Беларусі. На дадзены момант вуліц з такой назвай у нашай краіне 52. А першая з'явілася ў Мінку ў 1926 годзе. Гарсавет прыняў рашэнне перайменаваць старажытную Казмадзям'янскую (яна ішла ад плошчы Свабоды ўніз, да цяперашняга метро «Няміга»). Праўда, назва не прыжылася, і ўжо ў пачатку 1930-х вуліца стала насіць імя Дзям'яна Беднага. У час нямецкай акупацыі імя Скарыны атрымаў Пушкінскі пасёлак — квартал паміж праспектам, вуліцамі Сурганава, Якуба Коласа і плошчай Калініна. У 60-я гады імя Скарыны атрымала вулачка ў Сяльгаспасёлку (1-ы завулак Скарыны існуе там і цяпер). З 1990-га імя Скарыны стала насіць Акадэмічная, а ранейшая вуліца ў сяльгаспасёлку стала вуліцай Алешава. Ну, і нарэшце ў 1991-м імя Скарыны атрымала галоўная вуліца Мінска, былы Ленінскі праспект. А праз 14 гадоў імя Скарыны стала насіць вуліца на ўскраіне горада, Скарына пераехаў на былы Старабарысаўскі тракт.

Лепш зразумець Скарыну і яго эпоху дапаможа ўнікальная выстаўка, якая працягнецца да канца года.

Паліна СКУРКО

Скарынаўская кніга ў мініяцюры

500-годдзе беларускага кнігадрукавання — адметная дата, важная не толькі для беларусаў, але і для сяброў нашай краіны. Узгадваючы Францыска Скарыну, у Азербайджане выдалі ў мініяцюры Кнігу Юдзіфі. Ажыццявіла ўнікальнае выданне Зарыфа Салахава, стваральнік і заснавальнік Музея мініяцюрнай кнігі ў Баку. Праект музея ў серыі «Кніжная спадчына Францыска Скарыны» рэалізаваны з удзелам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Кангрэса азербайджанскіх абшчын Рэспублікі Беларусь.

— Усё ў гэтым свеце прыходзіць і сыходзіць, застаюцца толькі кнігі. Я шчаслівая, што гэтая кніга, нароўні з іншымі беларускімі кнігамі, стаіць у маім музеі. 2913 унікальных кніг музея трапілі ў Кнігу рэкордаў Гінеса, — распавяла Зарыфа Салахава. — У 2012 годзе я была ўзнагароджаная медалём Францыска Скарыны. І вельмі рада, што зараз магу апраўдаць сваю ўзнагароду. Францыск Скарына на пачатку 1517 года ў Празе адкрыў першую друкарню ва Усходняй Еўропе, а ў жніўні 1517 выдаў «Псалтыр». Да моманту выхаду Кнігі Юдзіфі ў 1519 годзе ён выдаў ужо 22 кнігі. Гэта быў вялікі чалавек.

Фармат мініяцюрнай кнігі Скарыны — 50 на 55 мм. Яна складаецца з 214 старонак, куды ўваходзіць факсімільнае выданне, тое, што было выдадзена Францыскам Скарынам 9 лютага 1519 года на 26 аркушах. Перад кожным раздзелам у кнізе — партрэт Скарыны. Кніга выдадзена на беларускай, рускай і англійскай мовах тыражом 100 экзэмпляраў, 10 з іх Пасольства Рэспублікі Беларусь у Азербайджане накіравала ў Нацыянальную бібліятэку, яшчэ 10 — у Полацкі музей беларускага кнігадрукавання. Пяць экзэмпляраў атрымаў Прэзідэнт Беларусі і тры — міністр культуры нашай краіны.

Вялікі ўнёсак ва ўмацаванне сяброўства дзвюх дзяржаў робіць Пасольства Азербайджанскай Рэспублікі ў Беларусі і Кангрэс азербайджанскіх абшчын Рэспублікі Беларусь. Старшыня кангрэса Націк Багіраў адзначыў:

— Для нас, прадстаўнікоў азербайджанскай дыяспары ў Беларусі, для каго Беларусь — другая радзіма, вялікі гонар мець дачыненне да гэтага выдавецкага праекта. Зарыфа Салахава зрабіла цудоўны падарунак да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Гэта прыгожая дата, якой можа ганарыцца кожны беларус.

Беларуска-азербайджанскае творчае сяброўства з кожным годам умацоўваецца. У Беларусі таксама выходзяць кнігі азербайджанскіх аўтараў і пераклады з азербайджанскай мовы.

Фота Кастуся Дробава.

Зарыфа Салахава прадстаўляе Кнігу Юдзіфі.



— Скажу па сакрэце, што да наступнай кніжнай выстаўкі мы плануем выдаць анталогію азербайджанскай паэзіі па-беларуску, — паведаміла беларуская паэтка Таццяна Сівец. На прэзентацыі Кнігі Юдзіф Таццяна Мікалаеўна прапанавала ўвазе свой пераклад трох вершаў класікаў азербайджанскай паэзіі.

Навум Гальпяровіч, беларускі паэт і журналіст, таксама творча падрыхтаваўся да прэзентацыі: напісаў верш «Ці быў Скарына ў Баку?..», які, безумоўна, прысвяціў Зарыфе Салахавай, Скарыну і сталіцы сонечнага Азербайджана. Дарэчы, Зарыфа Цеймураўна паабяцала выдаць гэты верш — у фармаце мікра.

Саюз пісьменнікаў Беларусі па даручэнні старшыні Мікалая Іванавіча Чаргінца ўзнагародзіў Зарыфу Салахаву памятным дыпломам за вялікі ўнёсак у развіццё беларуска-азербайджанскіх адносін і шматгадовую папулярызацыю твораў беларускіх аўтараў за мяжой.

Ксенія ВЯДЗМЕДЗЬ

Мы пачынаем цыкл публікацый, якія знаёмяць з сёлетнімі лаўрэатамі Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Асобы і іх работы — творы прозы і паэзіі, навуковыя даследаванні — стануць прадметам абмеркавання. Але галоўнае — гаворка пойдзе пра задачы пісьменнікаў у свеце і месца літаратуры ў ім. Адкрывае гэты цыкл размова з асобай, што даследуе гісторыю беларускай літаратуры.

ЛІТАРАТУРНЫ ПРАРЫЎ,

альбо Ці ўсе класікі на сваіх месцах?

Кожны мастацкі твор для тэкстолага — тайнапіс. Таму невыпадкова гэта слова патрапіла на вокладку манаграфіі Валерыя Назарава, прысвечаную творчасці Андрэя Мрыя. Валерый Фадзеевіч працуе ў аддзеле тэксталогіі Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, браў удзел у падрыхтоўцы Збораў твораў Якуба Коласа ў 20 тамах і Івана Шамякіна ў 23 тамах. Вучыўся на філалагічным факультэце БДУ і ў аспірантуры НАН, сваімі галоўнымі настаўнікамі лічыць літаратуразнаўцу Галіну Сініла, мовазнаўца Барыса Нормана, тэкстолага Тэрэзу Голуб, літаратуразнаўца і тэкстолага Міхася Мушынскага. У якасці найбольш уплывовага мрыязнаўца згадвае Пятра Васючэнку. Размова з сёлетнім лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі распачынаецца віншаваннямі і перасоўваннем стосаў кніг і газет у кабенеце аддзела тэксталогіі...

Фота Кастуся Дробава.

Валерый Назараў.

— Валерый Фадзеевіч, у НАН даследуецца творчасць класікаў, выдаюцца новыя зборы твораў. У чым значнасць гэтых праектаў для беларускага грамадства?

— Калі параўнаць беларускія дасягненні ў тэксталогіі з дасягненнямі нашых калег у суседніх краінах, атрымліваецца, што мы вельмі адстаём, бо навуковых выданняў нашай класікі не так і многа. У серыі «Беларускі кнігазбор» выходзяць аднатомнікі, якія часам маюць даволі высокі ўзровень каментавання, але здараецца, што з-за недахопу часу ці з іншых прычын увесь матэрыял належным чынам не асветлены. Аддзел тэксталогіі Інстытута літаратуразнаўства знаходзіцца ў больш выйгрышным становішчы, бо ў нас ёсць час на вывучэнне не толькі архіва (аўтографаў, машынапісаў, асабістых рэчаў), але і дакументаў, якія маюць дачыненне да жыцця пісьменніка, галоўных перыпетый яго біяграфіі. Гэта дазваляе асвятліць творы больш глыбока, падрабязна, з большым веданнем жыццёвых матэрыялаў. У гэтым плане нашы выданні трошкі больш змястоўныя.

...Людзі любяць глядзець мастацкія фільмы і серыялы, і не толькі каб адпачыць ад працы. Часам яны вельмі глыбока суперажываюць героям. А калі мы ведаем, што жыцці нашых класікаў былі нашмат больш цікавымі за лёс герояў кінастужак, то гэта прыўкрашвае і наша жыццё, робіць яго цікавейшым.

Напрыклад, Янка Брыль з 1940-х гадоў ведаў такую гісторыю. Калі ён працаваў у «Сцягу свабоды» — Мірскай раённай газеце, то запісваў сведчанні людзей з розных вёсак пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Адзін стары селянін расказаў, як знайшоў целы сына і ўнукаў па асабістай рэчы: ён падарыў сыну, калі той быў у партызанскай зоне, свой ножычак-складанчык, і калі прыйшоў на месца, дзе ўжывую палілі людзей, то адгарнуў самы большы асмалак чалавечага цела, убачыў пад ім свой ножык і зразумеў, што тут яго сям'я. Такім чынам, матыў пазнавання трагічнага лёсу блізкага чалавека па нейкай асабістай рэчы быў знаёмы Брылю амаль што з самага пачатку творчай біяграфіі. А на восьмым дзясятку жыцця ён атрымаў звесткі пра муштук роднага брата, які быў расстраляны сталіністамі ў Кіеве. Гэты муштук дазволіў пісьменніку больш падрабязна даведацца пра апошнія месяцы жыцця брата Валодзі. Выпадак выпадкам, але сітуацыя найцікавейшая!

— Як была напісана ваша манаграфія «Тайнапіс Андрэя Мрыя: падтэкст рэалій у творчасці пісьменніка»?

— Праца ішла складана і даволі доўга. У аддзеле была двайная планавая тэма: мы рабілі Збор твораў Якуба Коласа і пачыналі падрыхтоўку Збору твораў Івана Шамякіна. На 2011 — 2012 гады выпаў максімум нашай працы, калі за год выходзіла па шэсць — восем тамоў і аднаго, і другога пісьменніка. Тады мне стала зразумела, што Мрый — аўтар, не менш варты Збору твораў. Таму ў адносна свабодныя хвіліны, свабодныя дні цягнула займацца гэтым пісьменнікам — каб высветліць, на што ён намякаў і што зашыфраваў... Адчувалася, што яго творы маюць глыбокі падтэкст.

Узрушвае, што манаграфія атрымала Нацыянальную літаратурную прэмію ў год 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, юбілейны год Якуба Коласа, Янкі Купалы, стагадовы юбілей Пімена Панчанкі і Янкі Брыля. Да таго ж прыемна было атрымаць узнагароду ў горадзе Полацку, дзе неаднойчы быў у юнацтве...

— Іерархія класікаў створана. У чым актуальнасць далейшых даследаванняў іх творчых набыткаў?

— Кожны год з'яўляюцца новыя знаходкі, дакументы, адмысловыя матэрыялы. Таму працэс пазнання бесперапынны. Пра Мрыя каля 60 гадоў амаль не згадвалі ў друку, а калі напрыканцы 1980-х адбыўся прарыў забароненай раней літаратуры, стала зразумела, што не ўсе класікі на сваіх месцах. Некаторыя месцы былі пустыя да гэтага часу. Нельга сказаць, што пра класікаў мы ведаем усё. Нават калі выйшаў поўны збор твораў — гэта значыць, што сабраны ўсе матэрыялы, якія вядомыя, даступныя на дадзены момант, — усё роўна праз год-два, праз некалькі месяцаў знаходзяць дарчы надпіс, нейкі дакумент. Напрыклад, сёння да нас у аддзел заходзіла ўнучка Якуба Коласа Вера Міцкевіч (дачка яго старэйшага сына Данілы), якая прынесла тэкст артыкула, апублікаванага ў 1907 годзе ў газеце «Минское Слово». Гэты тэкст, падпісаны псеўданімам Кудесник, асвятляе падрабязнасці настаўніцкага з'езду ў Мікалаеўшчыне і можа мець да Якуба Коласа самае непасрэднае дачыненне. Кожны новы матэрыял — новая рысачка да партрэта творцы. Тэкстолагі павінны падаць матэрыял належным чынам, цікава і якасна. Калі якасць працы высокая, то чытаць збор твораў будзе цікава. Увогуле ж, у многіх беларускіх аўтараў нават няма базавага навуковага выдання, у тым ліку ў Андрэя Мрыя...

— Ці плануецца гэта выданне ў НАН?

— Працаваць над Зборам твораў Мрыя было б вельмі добра, але пакуль такіх планаў няма. Гэта вялікая праца, хаця манаграфія — ужо значная частка рэальнага і гісторыка-літаратурнага каментарыя... Тым не менш павінны быць дадатковыя даследаванні, павінна быць выканана пошукавая работа, таму што раннія публікацыі гэтага пісьменніка даследаваныя не вельмі добра.

— Якія знаходкі і адкрыцці здараюцца ў тэкстолагаў?

— У нашай працы шмат неспадзяванак, часта мы самі не ведаем, як выйдзем на патрэбныя звесткі, і гэта атрымліваецца амаль выпадкова. Напрыклад, у Якуба Коласа ў вершаваным апавяданні «Першы заработак» чытаем, што маленькі хлопчык, зайшоўшы ў хату, зірнуў на абраз «таго святога, што напісан быў з ягняткам і глядзеў так строга». Які гэта святы? Мы доўга шукалі адказ. А потым выпадкова я прагледзеў па тэлебачанні перадачу пра Гентцкі алтар — там акурат ёсць гэта славутая работа: строгі святы з ягняткам — Ян Хрысціцель. Такой была заходняя традыцыя выяўлення Яна Хрысціцеля, і так мы прыйшлі да высновы, які святы быў намаляваны на адным з абразоў у сялянскай хаце.

— Калі б вам прапанавалі 100 тысяч долараў для папулярызацыі творчасці класікаў, якія праекты вы б ініцыявалі, фінансава падтрымалі?

— Было б добра рабіць сур'ёзныя дакументальныя перадачы пра класікаў, мастацкія стужкі, экранізацыю сапраўды добрых спектакляў, якія прывабілі б гледача, чытача да творчасці пісьменнікаў. Дадатковыя сродкі добра было б выдаткаваць і на стварэнне гіпертэкставых і мультымедыйных дакументаў, якія зацікавілі б маладое пакаленне, і на навуковую дзейнасць...

Юлія ШПАКОВА

Палачане

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

«ВУЧЫЦЕЛЬ»

Ён не быў у маім горадзе высокім начальнікам, дэпутатам, у гады майго дзяцінства гэты высокі, хударлявы, з доўгімі сівымі валасамі чалавек быў кіраўніком драматычнага гуртка гарадскога Дома піянераў. Дзіўна, што пра яго з павагай адгукаўся мой бацька, чалавек увогуле далёкі ад кола полацкай інтэлігенцыі, просты рабочы з сямікласнай адукацыяй, але, як карэнны палачанін, абазнаны ў знакавых постацях нашага на той час невялікага пасляваеннага горада.

Гэта яго добраму водгуку я быў абавязаны шчасцю наведваць драматычны гурток з другога класа школы: Анатолю Сцяпанавічу цяжка было выбраць ролю для маленькага худзенькага другакласніка, але ўсё ж мне дасталася іграць Вішаньку ў п'есе Джані Радары «Чыпаліна»…

Ён добра гаварыў па-беларуску. Праўда, не заўсёды, але калі пераходзіў на мову, яна ў яго вуснах гучала натуральна і прыгожа. Сярод людзей нашай полацкай ускраіны часцей чулася «трасянка», настаўнікі пераважна гаварылі паруску, а мова Анатоля Сцяпанавіча была падобная да той, што мы чулі па радыё.

Заканчваўся навучальны год, я пераходзіў у другі клас, а ў гуртку была ўжо гатова прэм'ера. І меліся мы яе паказваць не дзе-небудзь, а ў піянерскім лагеры «Гваздова», што за кіламетраў дзесяць ад горада. Анатоль Сцяпанавіч загадаў нам узяць з сабой рукзакі з самым неабходным, бо меліся адпраўляцца на машыне з начоўкай на цэлыя суткі. Бабуля дома сустрэла такую вестку ў штыкі: куды, маўляў, такому жэўжыку на суткі без бацькоў адпраўляцца, але бацька, зноў памянуўшы добрым словам Анатоля Сцяпанавіча Камянкова, як гаворыцца, блаславіў. Але замест сутак наша падарожжа працягнулася ўдвая больш.

Толькі мы сабраліся ў Доме піянераў, як кіраўнік гуртка паведаміў, што паездка па нейкіх прычынах пераносіцца на заўтра… Дадому вяртацца не хацелася, і мы ўпрасілі Анатоля Сцяпанавіча застацца чакаць нашых «гастроляў» там, дзе сабраліся, не разыходзіцца па дамах. Наш кіраўнік узяў на сябе вялікую адказнасць, за якую мог бы панесці пакаранне. Хатніх тэлефонаў тады не было ў большасці бацькоў, і яны нас павінны былі чакаць на наступны дзень, а не праз двое сутак…

Мы засталіся начаваць у Доме піянераў: Анатоль Сцяпанавіч прынёс у вялікі пакой спальныя мяшкі. Вось тады я ўпершыню і пачуў ад настаўніка тое, што на доўгія гады запаланіла маю душу і стала асновай далейшага жыцця і дзейнасці. Гэта былі полацкія легенды і паданні.

Памятаю расповед пра слаўнага князя Усяслава: «Незвычайным было і рашэнне князя Усяслава Полацкага пабудаваць у Полацку храм Святой Сафіі. Бо ўбачыў ён тры разы ў сне дзеву ваяўнічую ў чорным воблаку, асветленую бліскавіцамі, са святым крыжам у правай руцэ. А потым перамянілася хмара, і ўзнік храм, куды ўвайшла дзева. І быў глас вельмі страшны: "Се Софея, сиречь Премудрость…"».

Анатоль Сцяпанавіч расказваў пра доўгія падземныя хады ад Кадэцкага корпуса да Сафійкі і як Падземны чалавек, сівы стары, прывёў хлопчыка Янку ў цудоўны падземны горад, а калі той не паслухаўся і захацеў падгледзець, як туды ісці, пакінуў яго там назаўсёды... Не надта памятаю, як прайшло наша выступленне, як наладзілі вэрхал мае хатнія. Затое як цяпер памятаю дзве бяссонныя ночы і голас настаўніка, які адкрываў мне таямніцы гісторыі слаўнага горада.

Потым я яшчэ не раз сустракаў Анатоля Сцяпанавіча ў самых розных абставінах, і нават калі ўжо працаваў у мясцовай газеце. Ведаў, што ён выкладае мову і літаратуру ў школе ў цэнтры горада і гурток болей не вядзе.

Але і сёння ў маёй памяці ён застаецца адной з самых знакавых постацяў, сапраўдным таленавітым і цікавым чалавекам, «вучыцелем», палачанінам.

Перапоўнены куфар

Змяншэнне цікавасці да чытання літаратуры, пра што так часта ды бясплённа вядуцца гаворкі ў творчых і акадэмічных асяродках, стала прычынай і яшчэ адной досыць пашыранай сёння з'явы: змяншэнне адказнасці чалавека, які выдае кнігу, за свой мастацкі плён. Чытацкая аўдыторыя часам настолькі маленькая, што цалкам ахоплівае сяброўска-сямейнае кола, дзе цябе абавязкова прымуць, прачытаюць і дадуць выключна станоўчы водгук. Паколькі руплівыя аўтары ўжо даўно імкнуцца выдаваць кнігі за свой кошт невялічкімі накладамі (100, 200, 300 асобнікаў), то на рэдактарах амаль заўсёды эканомяць. Гэта зразумела. Але маё перакананне застаецца нязменным: кніга без рэдактара — усё адно што неахайны ў знешнасці чалавек. Унутраная прыгажосць і высакародства раскрываюцца цягам знаёмства ці, прынамсі, працяглай размовы. А размова можа не адбыцца, калі цябе адштурхне непрывабны знешні выгляд. Калі ў кнізе на сотню вершаў будзе хаця б дзясятак такіх «недагледжаных», то гэта адназначна сапсуе ўражанне, не дазволіць ацаніць тое сапраўды каштоўшнае і непаўторнае, чым мае падзяліцца аўтар.

Мабыць, прычына такога стану «палегчанай» адказнасці яшчэ і ў тым, што сёння выхад кнігі вершаў ці празаічных твораў далёка не заўсёды ўспрымаецца як падзея ў літаратурным жыцці краіны, але як важная падзея ў жыцці кожнага асобнага аўтара — заўсёды. Маўляў, мая асабістая справа — як хачу, так і раблю. І гэта зразумела. Сёння многае «праходзіць» міма ўвагі літаратурнай перыёдыкі, многае не заўважаецца і забываецца раней, чым адбудзецца прэзентацыя. Таму таленавітыя людзі, чый творчы куфар час ад часу напаўняецца радкамі, строфамі, абзацамі, дзеляцца гэтым набыткам з тымі, хто побач, хто можа ацаніць і заўважыць. Такое своеасаблівае змяшчэнне сутнасных акцэнтаў пісьменніцкай дзейнасці.

У новай кнізе Святланы Куль «Вершы. Байкі. Паэмы» (Гародня: «ЮрСаПрынт», 2017) няма знарочыстай літаратурнасці. Аўтарка сапраўды нібы паклала на паэтычныя радкі музыку сваёй штодзённасці: жыццё паміж дзвюма краінамі, паміж успамінамі пра юнацтва і днём сённяшнім, паміж цеплынёй бацькоўскага дома, што засталася адно ў душы, і скразнякамі адзіноты… Лірычная гераіня шчымліва-шчырая ў раздзелах «Асабістае» і «Настальгія» *(«Ідзі адсюль. Ідзі. / Ты тут чужая. / Прыходзь пасля. Калісьці. Неяк потым. / У кубках двух — гарбата залатая. / А ты ідзі адсюль, мая самота»)*; роспачна-адважная ў раздзеле «Вайна», дзе асэнсоўваюцца трагічныя і складаныя грамадска-палітычныя працэсы сучаснасці *(«Мой час сапсаваўся, не вытрымаў гэтага лета, / Зламалася нешта — ці голас, ці сэрца, ці памяць. / Пайду да майстэрні, дзе ёсць дзыгармайстар-кабета, / Яе папрашу — можа, час паламаны паправіць»)*; гарэзліва-саркастычная ў байках, баладах і песнях *(«Аднойчы Зеўс гарэзаў-муз / Злучыць прыдумаў у Саюз, / Маўляў, ім будзе так утульней, / Амброзію паводле плана / Падзелім цэнтралізавана, / Без розных закулісных гульняў!»)*. Яркія, запамінальныя палкім гучаннем вершы ёсць і ў раздзеле «Вянкі, вясёлкі, нізкі»: аўтарка шукае новыя сэнсы ў класічных формах (вянок санетаў «Гітара»), шукае суладдзе колераў і мелодый, спрабуючы знайсці слоўны код музыкі і фарбаў… Адметнасць мастацкага

афармлення ў тым, што паэтычныя радкі аздобленыя выцінанкамі Вольгі Бабурынай. Выкарыстаныя ў якасці ілюстрацый, яны сапраўды нібы «праяўляюць» тое, што паэтка пакінула непрамоўленым.

Але кніга ўсё-ткі перагружана радкамі-паўторамі, што ўспрымаюцца як водгулле беларускай паэзіі розных перыядаў: у паэмах адчуваеш «купалаўскі» пачатак мінулага стагоддзя, у вершах пра каханне — узнёслую скруху «паводле Яўгеніі Янішчыц», у настальгічных вершах і песнях, прысвечаных сябрам, — бардаўскія адгалоскі 1990-х. Для самой Святланы Куль гэта ўсё, безумоўна, аўтэнтычна, сугучна імгненню стварэння пэўнага верша, але для чытача (а кніга адрасаваная шырокаму колу, як пазначана ў анатацыі) многае арыгінальным і глыбокім не будзе. Гэта тое самае змяшчэнне сутнасных акцэнтаў, пра якое вялося ў пачатку: не ўлічваецца агульны літаратурны кантэкст, а толькі кантэкст індывідуальнай творчай эвалюцыі. Ствараецца такая сітуацыя, калі сучасны аўтар не бачыць сябе ў агульным кантэксце (свядома ігнаруе яго) альбо не бачыць кантэксту і ўрэшце аказваецца ў двухсэнсоўным становішчы.

Святлана Куль, вядома, звяртаецца да асэнсавання матываў сваёй творчасці і фармулюе іх вельмі дакладна:

Нашто пішу? Ці я павінна
Жыццё аддаць такой рабоце?
Ляплю чарговую цагліну
У папяровым пераплёце.
…
З вяршыні ў неба дакрычацца б,
З сваёй цаглінкі — да Нябёсаў.

Хіба не ўсе паэты свету спрабуюць праз слова дакрычацца да нябёсаў?

Праўда, паэзія, паэтычная творчасць для аўтаркі — не магістральны шлях. Доктар гістарычных навук Святлана Куль вядомая найперш як аўтар многіх каштоўных навуковых распрацовак, таму літаратурная творчасць для яе ў пэўным сэнсе — жыццёвая ўзбочына. І ў такім выпадку ўсё-ткі варта вельмі адказна паставіцца да пытання, наколькі шырокім павінна быць кола чытачоў, калі кніга не ёсць плёнам прафесійнай дзейнасці.

Жана КАПУСТА

НАДЗЕІ СУЦЯШАЛЬНЫ ЗНАК

Новая кніга лірыкі Генрыха Тарасевіча «Носьбіт» (Мінск: ПроняПлюс, 2017) прасякнутая дыдактычнымі і гумарыстычнымі матывамі. Паэт, знаёмы чытачу па папярэдніх кнігах «Прадчуванне вясны» і «Адлюстраванне душы», выкрышталізоўвае свой адметны светапогляд на ментальнасць, нацыю, грамадства і сям'ю.



Носьбіт беларускай ідэі Г. Тарасевіча — гэта высокадухоўны, высокамаральны чалавек, які разумее каштоўнасць ісціны, змагаецца з фальшам, пустаслоўем, ілюзіяй і падманам. Гэта асоба, якая разумее сэнс сапраўднай, высокай, класічнай паэзіі («Паэзія»). Для лірычнага героя аўтара слова не проста спосаб выражэння думкі, а гаючыя лекі ў свеце духоўнасці, што ратуюць ад бед, натхняюць, лечаць, загойваюць душэўныя раны («Розныя словы»). У мастацкім свеце Г. Тарасевіча дабрабыт уладкаваны, але яму не надаецца выключнага значэння. Аўтар заахвочвае сваіх чытачоў любіць беларускі край, а не імкнуцца ў невядомасць, на чужыну.

Бясспрэчна, скупасць як загана непрымальная для лірычнага героя Г. Тарасевіча. Пры ўдумлівым прачытанні вершаў паэта з'яўляецца разуменне таго, што духоўная шчодрасць выхоўваецца бацькамі ў душах дзяцей з самага ранняга дзяцінства. Для Г. Тарасевіча, як і для ягонага лірычнага героя, менавіта маці з'яўляецца ідэалам духоўнай прыгажосці, а значыць, носьбіт аўтара — клапатлівы, добры, сардэчны сын. Акрамя таго, і цешча ўспрымаецца ім як родная мама, што на сёння — рэдкая з'ява, паколькі многія абмежаваныя стасункамі ўнутры сямейнай ячэйкі «муж — жонка — сын ці дачка».

Для аўтара кнігі ўласцівае ўзвышанае, апалонаўскае ўспрыманне жонкі, у якой няма хібаў і заган («Трыццаць год я ўжо разам з табою»). У пэўнай ступені Г. Тарасевіч абагаўляе зямную жанчыну, успрымае яе як музу («погляд твой трапяткі і жаданы», «ты мне і неба, і зямля…»). Так, у творчасці аўтара пах парфумы — адзнака загадкавай жаночай сутнасці, а бязмежная цеплыня, далікатнасць і пяшчота лірычнага героя ў адносінах да каханай жанчыны — мудрай, гаспадарлівай, надзейнай жонкі — выяўляе высокую ступень узаемнага даверу, эмацыйнага адзінства паміж людзьмі, якія разумеюць адзін аднаго без слоў («Нясцерпны для мяне той рэдкі час…»).

Гультайства, лянота, бяздзейнасць, пасіўнасць ва ўспрыманні Г. Тарасевіча — сінонім заняпаду грамадства і, у прыватнасці, кожнай асобы. Паэт слушна сцвярджае, што лянота прыгнятае чалавека, а праца (стваральная дзейнасць) развівае, мабілізуе, напаўняе сэнсам кожны новы дзень: «Лянівы сам сабе нашкодзіць, / А хто шукае — той знаходзіць. / Імпэт патрэбна ўкласці ў справу, / Каб завяршыць яе на славу». Герой вершаў Г. Тарасевіча сціплы і самадастатковы, заклікае нас быць стрыманымі ў выказваннях пра ўласныя поспехі, раіць не быць пыхлівымі («Не хвалі сябе на людзях»).

Адназначна, у аўтарскім разуменні «ілжывыя меркаванні» несумяшчальныя з ісцінай, верай у дабрыню, надзеяй на лепшае, а дасягненне людзьмі сваёй выгады праз падман ці махлярства для паэта цалкам непрымальнае. У вершы «Надзея» Г. Тарасевіч выказваецца так: «Заўжды ў часы ліхіх выпрабаванняў, / Надуманых ілжывых меркаванняў / Надзея дорыць суцяшальны знак». Як бачым, тут прысутнічае элемент дыдактызму пры асветніцкім падыходзе да рэчаіснасці.

Для творчасці паэта характэрная цесная знітаванасць лірычнага героя з Богам, быццём, духоўным светам іншых людзей, Радзімай, прыродай. Г. Тарасевіч звяртаецца да Бога з просьбай даравацъ яму мудрасць: «Ласкавы Божа, дай мне розум / З самім сабой пражыць у згодзе, / На ўсе часы дай сталы роздум / На справы ў свеце… і прыродзе». «Праекцыя» вобраза аўтара напластоўваецца на вобраз лірычнага героя дзякуючы ягонаму багатаму духоўнаму досведу.

Прырода — адна з крыніц натхнення, радасці для паэта. У прыватнасці, мястэчка Новы Двор для Г. Тарасевіча — блаславёнае месца юнацкіх захапленняў, адкрыццяў, сяброўскіх сустрэч, а беларуская зямля — святыня. У вершы «Новы Двор» аўтар трапна сцвярджае: «Адно ёсць месца на Зямлі, / Дзе піў я цёплы сырадой». Мастак слова сакралізуе прыроду таго мястэчка, дзе нарадзіўся, і сваю Бацькаўшчыну ў цэлым.

Паэт звязвае носьбіта беларускай ментальнасці з прасторай роднага краю. Мінск для яго — «мясціна Боскае прыроды і ратнай мужнасці крыніца». Для паэта Г. Тарасевіча гэта тое святое месца, дзе з Боскай дапамогаю здзейсніліся ягоныя запаветныя мары. Акрамя таго, і ён сам «спавядае» духоўную чысціню. Паэт разумее, што зайздрасць, зло, нянавісць ва ўзаемаадносінах нярэдка тлумачацца бяздумным пажаданнем іншым нядобрага, благога і становяцца праклёнам для абодвух бакоў («Праклёны, быццам тыя гусі…»). А Бог — невычэрпная крыніца міласэрнасці, шчасця, вернасці біблейскім ісцінам («Сакральнае»).

Звяртаецца Г. Тарасевіч і да асэнсавання моўнай праблемы: нягледзячы на тое, што ў нас дзве афіцыйныя мовы, беларуская мова «дадзена <…> нам не ў нагрузку, а каб адметным край быў свету наш». А значыць, носьбіт — гэта высокаадукаваны, з энцыклапедычнымі ведамі і практычнымі навыкамі і ўменнямі беларус па стане душы і стане свядомасці.

Літаратурным настаўнікам Г. Тарасевіч лічыць Янку Купалу. У вершы «Носьбіт» паэт шчыра кажа пра сябе: «Я пільны носьбіт памяці народа, / Ягоны дух у еднасці са мной». А значыць, носьбіт — гэта яшчэ і пераемнік, прадаўжальнік культурнай традыцыі, духоўнага багацця, якое назапашваецца ў літаратуры і мастацтве гадамі і адмыслова праяўляецца ў пэўны час і ў пэўным месцы.

Нягледзячы на тое, што ад часоў Раства Хрыстова «не стаў дабрэйшым чалавек», імкненне перамагчы зло, надзея на духоўнае выратаванне расце і запаўняе прастору ў свеце лірычнага героя і свеце аўтара кнігі. Носьбіт Г. Тарасевіча — гэта моцная, адданая сваёй Радзіме, грамадству і сям'і асоба, якая сцвярджае сваімі ўчынкамі, а не пустымі словамі, агульначалавечыя ідэалы дабрыні, мужнасці, адказнасці за іншых.

Таццяна МАЦЮХІНА

Постаць Максіма Танка за лініяй небасхілу

1.

Мой бацька, паэт Леанід Дранько-Майсюк, вельмі любіць дакументальна-праўдзівы фільм пра апошнія дні Гітлера «Бункер» і заўсёды знаходзіць час яго перагледзець. Захапляецца стужкамі Джэкі Чана, бо ў гэтых кунфу феерыях усю небяспечную акрабатыку (часам з сапраўдным ламаннем рук і ног) робіць без падману сам выканаўца галоўнай ролі.

«Нашае жыццё напоўненае маной, але цяжка даць пэўны адказ добра гэта ці кепска. Вядома толькі адно: падман недапушчальны ў мастацтве. Таму і ёсць сэнс складаць вершы, пісаць прозу, здымаць фільмы, бо толькі ў гэтай умоўнай прасторы можна жыць без падману», — любіць паўтараць ён словы Максіма Танка. У пачатку 1990-х тата быў рэдактарам яго апошняй кнігі *«Errata»*, бываў у паэта дома. Шмат гутарыў з ім, увечары пераказваў мне пачутае. Гэта былі сапраўдныя авантурна-прыгодніцкія апавяданні пра маладога аўтара паэмы «Нарач», які хаваўся ад шпікоў, падманваў польскі суд, дурыў паліцыю, не прапускаў ніводнай кінапрэм'еры, захапляўся Чурлёнісам і Кандзінскім.

Калі па тэлевізары паказвалі стужку Джэймса Уэйла «Нявеста Франкенштэйна», мы абавязкова глядзелі, бо гэта «любімы фільм Максіма Танка». Калі па радыё гучала опера Манюшкі «Страшны двор», слухалі менавіта арыю Ганны, якая «натхняла паэта». Аднойчы каля пад'езда нас абступілі некалькі мордаваротаў, адзін з іх дастаў кастэт. Бацька, не крануўшыся з месца, марудна надзеў скураныя пальчаткі, затым гэтак жа няспешна паклаў руку ў кішэню. Яго спакойна-суровы выгляд астудзіў хуліганаў: «Чё, боксер, что ли?.. Ладно, братан, лады…». Калі яны разышліся, тата падмігнуў мне: «Метад Максіма Танка! Бачыш, спрацаваў! Тое ж самае здарылася з ім на адной з начных віленскіх вулачак, калі паэт ішоў на спатканне да будучай жонкі. Як маеш пры сабе скураныя пальчаткі і ўмееш захоўваць спакой — пераможаш, так ён мяне вучыў, сынку, і, як бачыш, не зманіў».

Уплываў Максім Танк і творча. Верш «Марк Шагал» (1977 г.) праз пяць гадоў натхніў бацьку на стварэнне паэмы «Віцебск. 1922», у якой Шагал раіць п'янаму матросу-рэвалюцыянеру ісці заваёўваць Еўропу… гуляючы па небе.

Любоў Максіма Танка да прадметна-выразнай паэзіі, у якой звычайным рэчам надаецца гратэскна-нечаканае, метафарычна-парадаксальнаезначэнне, — блізкая і ранняму Дранько-Майсюку.

Максім Танк у адным са сваіх вершаў гэтак экспрэсіўна апісвае... вітрыны магазінаў:

Як флейты бутэлькі з віном,
Як бандуры вэнджаныя кумпякі,
Як бубны паджарыя булкі,
Як барабаны бочкі з селядцамі,
Як смыкі скрыпак салямі..."

У маладога Дранько-Майсюка: «...дубальтоўкі на плячы, / Як сцёгны знішчанай жывёлы...»; «Шэрая торба падобна / На забітага зайца»; «...сад падобны да сабакі...»; «Лімонныя, як пальцы негра, / Струмені малака цякуць...».

А перачытайце паэму Дранько-Майсюка «Кола», якой так захапляўся Міхась Стральцоў. Шалёная дынаміка, дзе людзі, прадметы, сама прырода разам з «цяжкім трамвайным колам» рухаюцца, круцяцца з усё большай і большай хуткасцю, іранічныя партрэты паліцыянтаў, якія бароняць ад кола «крыж і Варшаву», — усе гэта настраёва і эстэтычна еднасна ранняй паэзіі Максіма Танка, якая па сваёй імклівасці нагадвае полечку.

Аўтар вокладкі — Эліна Сапожнікава.

Дарэчы, полька — любімы танец абодвух паэтаў. Нездарма Максім Танк з усіх танцаў аддаваў перавагу ёй. Нездарма менавіта Дранько-Майсюк напісаў тэкст да песні «Полька беларуская».

Імкненне гэтых творцаў насычаць свае раннія вершы і паэмы несупынным рухам мае, аднак, і пэўныя адрозненні. У Максіма Танка ўсё ж такі дзейнічае закон прыцягнення — шагалаўскай бязважкасці тут мы не знойдзем: цыганскі конь «цяжка брыдзе», у Рыа-дэ-Жанейра менавіта па моры «прыйшоў» параход, «ашалелыя, з грывай агню цягнікі павязлі восень з вёсак у горад» строга па рэйках, ніяк іначай. Ну, а ў Дранько-Майсюка «...над пляцам кружыліся дошкі...», «да бруку ляцелі крыжы і цвікі, сцягі караблёў і ўчарнелыя ванты», з лёгкасцю пушынкі «гранітная качка ляцела».

2.

Калі Максіма Танка не стала, мой бацька пачаў ездзіць у Вільню. Ён хадзіў па тых жа мясцінах, дзе бываў яго любімы паэт, знаходзіў у архівах не чытаныя іншымі даследчыкамі дакументы, так ці іначай звязаныя з асобай Максіма Танка, знаёміўся са старымі віленчукамі, якія памяталі «часы Пілсудскага». Па вечарах адпачываў у кавярні, піў піва (Максім Танк, дарэчы, не любіў гэты напой) і слухаў гурт «*AC/DC*», чыя музыка сугучная рытму ды экспрэсіі віленскіх зборнікаў «На этапах», «Журавінавы цвет», «Пад мачтай».

Дранько-Майсюк пісаў, што «…бачыў Максіма Танка ў старасці, але заўсёды хацеў убачыць яго маладым, дваццацігадовым, якім ён быў у першую сваю турэмную палову 1930-х».

У выніку гэтых паездак нарадзілася ўнікальная кніга «…Натуральны, як лінія небасхілу», якую аўтар вызначыў жанрава «архіўнай прозай». Кніга выйшла па часе вельмі ўдала — на пачатку верасня, за некалькі тыдняў да 105-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка і амаль за месяц да 60-годдзя яе аўтара. У аснову леглі паліцэйскія допыты, пратаколы, турэмныя рахункі, пракурорскія запіскі, паказанні зняволеных. Нягледзячы на гэты акіян дакументаў, кніга не ўспрымаецца цяжкаважным гістарычным опусам.

Перад намі — дакладны па фактах, займальны па змесце, унікальны па форме твор пра адзіночку, які са здзіўляльнай смеласцю і артыстызмам змагаецца з судовай сістэмай Пілсудскага і… перамагае! Амаль галівудскі сюжэт!

Праз усе 27 раздзелаў кнігі (серыял!) мы сочым, як падступны пракурор Пятроўскі і яго армія памагатых (ад недалёкіх паліцыянтаў да ўедлівых графолагаў) хочуць схапіць і заняволіць юнага паэта. Абставіны ўскладняюцца і тым, што ў рукі паліцыі трапляе запісная кніжка Браніслава Тарашкевіча, дзе згадваецца сапраўднае прозвішча Максіма Танка — Скурко…

Пісьменнік, як сапраўдны рэжысёр, з такой выразнасцю і напорам манціруе свой матэрыял, што ўзнікае ўражанне, быццам гартаеш не кнігу, а глядзіш кіно, якому пазайздросціў бы і Олівер Хіршбігель, стваральнік ужо згаданага намі «Бункера».

3.

Я чытаў гэтую аповесць, захапляўся непрыдуманым жыццяпісам галоўнага героя і ўспамінаў, як бацька смяяўся з прыхільнікаў бяздумнай апалагетыкі ўсёй без разбору беларускай літаратуры і засмучаўся агрэсіўным выпадам супраць «савецкіх» твораў Янкі Купалы, Аркадзя Куляшова, таго ж Максіма Танка.

Разважаючы ў сваёй кнізе пра апалагетыкаў, Дранько-Майсюк цытуе Максіма Танка: «…Наш засцянковы патрыятызм узвёў у сан святых і геніяў вельмі шмат пасрэдных вершаплётаў, даўшы іх творам завышаныя ацэнкі…».

Тым, хто не прымае ўсё савецкае, прысвечаны наступныя радкі: «Я ўжо неаднойчы заўважаў, як сапраўдны мастак ператвараецца ў аб'ект злой крытыкі толькі за тое, што ў нядаўнім мінулым быў аблашчаны ўладай; "савецкая" біяграфія такога мастака няўпынна прамацваецца, лепшыя творы не прымаюцца пад увагу».

Аўтар зайздросціць высокаму ўзроўню ўсходніх і заходніх калег, якія выдаюць шыкоўныя, пазбаўленыя інтэлектуальнай беднасці кнігі пра сваіх творцаў. І сумуе, што з часоў Міхася Зарэцкага ў Беларусі мала што змянілася.

Прымаць паэта такім, які ён ёсць, стварацъ на аснове яго твораў і жыццяпісу сваю адметную архіўную прозу — вось чаго не хапае Леаніду Дранько-Майсюку як чытачу ў нашай сённяшняй літаратуры. Вось пра што яго кніга «...Натуральны, як лінія небасхілу». Ён марыць (хаця гэтыя мары ўсё больш і больш працінае ягоны ж скепсіс), каб сённяшні беларускі інтэлігент быў такім жа, як і малады, смелы, дзівосны Максім Танк, каб наш сучаснік стаў нарэшце «...натуральным, як лінія небасхілу».

Васіль ДРАНЬКО-МАЙСЮК,
малюнак аўтара

ЖЫЦЦЁ ЯК БЯСКОНЦЫ ЛАБІРЫНТ

Літаратура заўсёды была звязана з пошукамі сэнсу жыцця, пошукамі самога сябе ў бязмежнай жыццёвай прасторы. Увагай да духоўнага свету чалавека, яго перажыванняў прасякнута і проза маладой пісьменніцы Святланы Саўко. Каб больш поўна перадаць пачуцці сваіх герояў, іх жаданні, трывогі, аўтарка выкарыстоўвае розныя сродкі мастацкай выразнасці: вобразы-сімвалы, трапныя параўнанні, якія дапамагаюць падкрэсліць свае думкі і стварыць асаблівы настрой у творах (апавяданні «Драпіны», «Па месячкавай сцежцы», «Дом»).

У апавяданні «Гісторыя адной Атлантыды», сімвалічным ужо сваёй назвай, раскрываецца працэс трагічнага пошуку самога сябе, адзіноты і трывога сучаснага чалавека. У сённяшнім складаным свеце без сэнсу, своеасаблівага ўнутранага компаса абысціся цяжка. Без яго лёгка збіцца з правільнай дарогі, трапіць у лабірынт.

Гісторыя адной Атлантыды — гэта гісторыя аднаго чалавека, што блукае ў бясконцым жыццёвым лабірынце. Як дагэтуль шукаюць міфічную краіну Атлантыду, так і чалавек знаходзіцца ў пастаянным і бясплённым пошуку самога сябе. Бессэнсоўныя пошукі, калі, блукаючы па лабірынце, штораз трапляеш у тупік, не выклікаюць ніякіх іншых пачуццяў, акрамя адчаю.

Каб больш поўна паказаць адзіноту чалавека ў вялікім свеце, Святлана Саўко ўводзіць у твор вобраз-сімвал пераходу. Пераход — не толькі месца, дзе змяняюцца падзеі. Пераход — сімвал адзіноты, адчаю, безнадзейнасці, жыццёвага тупіка, немагчымасці знайсці сябе.

Самае страшнае, што пераход зацягвае. Жыццё ў ім спынілася, нічога не мяняецца: «І вось я тут, ціснуся да цёплых бакоў капіравальных машын. І мне настолькі ўтульна, што выбірацца наверх няма ні жадання, ні сілы. Куды толькі падзелася ўся няўтрымнасць маёй натуры. Мяне быццам высмакталі гэтыя сцены». Чалавек адчувае, што няма ўжо ні сіл, ні жадання ісці далей. Знікае імкненне нават разважаць: «Развучылася думаць. Жывучы ў пераходзе, думаць не трэба. Нават шкодна. Калі пачынаеш думаць, раптам разумееш, што жыццё праносіцца над галавой, як хмары над пераходам».

І толькі неадчэпна муляе думка, што жыццё не склалася: «Чаму так склаўся лёс? І хто яго складаў, хто выбіраў толькі самыя цёмныя, самыя парэпаныя кубікі з канструктара жыцця? Хто складаў іх так бяздарна і бязладна, што замест замка атрымаліся развалiны? Каму толькі прыйшло ў галаву будаваць руіны?»

Немагчыма зразумець свайго месца, ролі ў жыцці. Гэтая думка мучыць і не дае спакою. Чалавек зыблытаўся ў пошуках самога сябе: «Мне б сысці куды-небудзь, сысці. Але куды? Тут мяне ніхто не трымае, але і там, наверсе, не чакаюць. Часам мне здаецца, што я рыбіна. І калі выцягнуць мяне з вады, то я загіну, задыхнуся. Калі ў душы разлад і думак не сабраць, і адчуванне такое, быццам знаходзішся ў каменным мяшку, і кісларoду засталося на два ўздыхі».

Каб дапамагчы выбрацца з пераходу, здабыць душэўны спакой, надзею на лепшае, аўтар уводзіць у твор ідэю патопу, стваральнай сілы вады, якая дапамагае кволым, нерашучым падняцца наверх.

Увесь трагізм сітуацыі ў тым, што эмацыйнае ўзрушэнне не дапамагло, галоўная гераіня так і не знайшла сябе, заблыталася яшчэ больш, і выхад бачыцца толькі там: «Я жыву наверсе, як заўсёды, адна і спрабую разабрацца: навошта? Як заўжды, мару пра ціхае месцейка. Шукаю новы пераход».

Пачуццё адзіноты, неўладкаванасці, няўтульнасці чалавека ў жыцці ўласціва многім літаратурным героям. Святлана Саўко працягвае традыцыі класічнай літаратуры. «Гісторыя адной Атлантыды» прасякнута болем за сучаснага чалавека з яго сумненнямі, пакутамі, душэўнымі пошукамі: «Мне сумна, бо і наверсе няма куды падацца. Мы ў пераходзе занадта ідэалізавана ўяўлялі сабе верхні народ. Верхні народ — гэта нашы былыя суседзі па пераходзе. Навошта тады было абапірацца на руку? Навошта?..»

Ганна ЛЫСАЯ

Дзмітрый ПЯТРОВІЧ

***

Завечаровіцца.
І восень неўзабаве
Жыццё расквеціць
фарбамі нязвыклымі.
Яно было
у залатой аправе.
Зняў акуляры —
кветкамі паніклымі
Усе чаканні
падаюцца сёння,
Не вабіць і шматколернасць сусвету.
Ў калодзеж памяці мо кінуцца?
Ў бяздонне
Юнача-трапяткіх радкоў паэта?..
Ён марыў стаць
калісьці адным з лепшых,
Шукаючы чароўнае ў будзённым, —
Царуе восень
у ягоным вершы,
Блукаючы сярод паніклых клёнаў...

***

Нібыта ў сне, я ў восені маёй.
Нічога больш не грэе мне душу.
Пакутна-спавядальна тчэ сувой
Зноў памяць — перад ёй не саграшу.

Для мемуараў мо яшчэ не выспеў час,
І столькі слоў, напэўна, не сказана.
Ды, мабыць, скажуць дзеці ўсё за нас...
А восень, незагоеная рана,

Пячэ агнём у сэрцы трапяткім
І адгукаецца самотна-жураўліна...
Запомні, восень, ты мяне такім —
Бо час бяжыць ракою хуткаплыннай...

Нібыта ў сне, я ў восені маёй.
Нічога больш не грэе мне душу.
Пакутна-спавядальна тчэ сувой
Зноў памяць — перад ёй не саграшу.

Для мемуараў мо яшчэ не выспеў час,
І столькі слоў, напэўна, не сказана.
Ды, мабыць, скажуць дзеці ўсё за нас...
А восень, незагоеная рана,

Пячэ агнём у сэрцы трапяткім
І адгукаецца самотна-жураўліна...
Запомні, восень, ты мяне такім —
Бо час бяжыць ракою хуткаплыннай...

***

Светлай памяці
Міхася Мікалаевіча Шавыркіна

Жыццё віруе —
у душы пустэча:
Сыходзяць лепшыя —
туды, за гарызонт,
Чародкай жураўлёў…
І незварот
Не вылечыць ніколі сэрца.
Стрэча
Адбудзецца калісьці...
Галасы
Сяброў маіх
не змоўкнуць аніколі.
Усё жыццё шукаем
лепшай долі.
А потым — рэха...
Плачуць верасы.
Не супакоіць гэта шматгалоссе...

Жыццё віруе —
у душы пустэча.
Сыходзяць лепшыя...
Баліць у сэрцы восень...
За ёй — зіма.
Нібыта шлях у вечнасць...

***

У вырай паляціць самотна лета
І стане настальгіяй-успамінам.
Барвовыя начэпіць эпалеты
Уладна восень. І агонь рабіны
Заззяе у жыцці зарою новай,
Памаладзее пасівелы сад.
А уначы сярэбранай падковай
Падасца Месяц. Шчасця зарапад
Атуліць нас з табою, дарагая,
І зорак спеў у соннай цішыні
Падасца нам малітваю... Згарае
Нарэшце ноч у хуткаспелым дні...



***

У кожным сонцы
бачым свайго Бога,
Калі ён нават прывідна-зямны.
Знаходзім генія —
ці добрага, ці злога.
Ды шлях свой —
ад калыскі да труны —
Не дадзена нам ведаць.
У Нябёсах
Усё размеркавана ўжо даўно...
Страчаем ранне
ў брыльянцістых росах —
Зары вячэрняй горкае віно
Мы п'ём...
Адхланна молімся Сусвету —
З надзеяй
зноў убачыць сонца ўранні,
Адкрыць сваю маленькую планету
Пад назваю шчасліваю —
Каханне...

***

У Пралесках маіх
спелай восені светлае ззянне
Разліваецца ў дні,
кароткім, як наша жыццё.
Дождж лье слёзы свае
аб нашым з табою расстанні.
Разнаколер жыцця —
як асенне-пярэсты шацёр.
Неўзабаве зіма —
можа, стрэну я шчасце зямное,
Мабыць, бляск любых воч
буду бачыць наяве і ў сне.
Шчэ напераздзе ўсё…
Ды ахоплена сэрца тугою
Аб каханні былым...
Спее мара аб новай вясне...

Язмін

Мой беласнежна-сонечны язмін
Кідае на зямлю пялёсткі-слёзы.
Шапочуць беластволыя бярозы —
Яго не супакояць... Бо адзін,
Заўжды адзін у гэтым дзіўным свеце,
Ён не знайшоў любові і спагады,
Пабачыўшы дажджы і снегапады, —
Падорыць прыгажосць табе, паэце...
Убор свой апрануўшы беласнежны,
Ён водарам салодкім гоіць сэрца —
Тады ў душы гучыць кахання скерца
І шчасце падаецца нам бязмежным...

Тацяна БАРЫСЮК

Калядны сум

Я пішу свой калядны дар — верш.
А натхнення — няма і не будзе.
Толькі самападманам — давер
да здзяйснення фантазій аб цудзе.

Я прачнуся бязрадасным днём
без амбіцый да ног зоры кінуць.
А каханы знікае са сном,
бо ён сам для сябе — сэнс адзіны.

А я жыць не магу і не жыць!
Божы клопат сыдзе паратункам.
А сляза ледзяная дрыжыць,
студзень сэрца снягамі ахутаў.

Будзе дзень — будзе мройлівы шанц
здзейсніць так, што дабро пераважыць.
Зноў у бой — без прываблівых зман,
што каханне і шчасце — дасяжны…

Цвіў язмін

(залатое сячэнне)

Памяці мамы

Помню: ты, маладая і жвавая,
нас на лецішчы клікала есці.
І язміну галоўкі бялявыя,
набрынялыя пахкаю аўрай,
нас натхнялі чароўнасцю весняй.

І, здавалася, будуць заўсёды
маладосць твая і неўміручасць.
Ты, нібы незгінальнасці ода,
ратавала ўсіх блізкіх спадручна.
А калі ты хваробе скарылася,
мы цябе зберагчы не адолелі.
Нас язміну журба белакрылая
ахінула самотным зняволеннем.

Што такое Лондан?

(залатое сячэнне перавернутае)

Заслужанаму прафесару
Арнольду МакМіліну
на 75-годдзе

Што такое Лондан? Гэта Таўэр,
Біг Бэн на Вэстмінстэрскім абацтве.
Тэмза і сабор Святога Паўла.
Веліч Бэкінгемскага палаца.
Гэта каралева-дзеці-ўнукі.
Універсітэт, музей брытанскі.
Дэндзі, «Бітлз», хіпі, бугі-вугі.
Смог над Сіці, плошчай Трафальгарскай.

Блумсбэры, цуд-паркі, квет-сады.
Тут архітэктуры стройнасць ліній
і парад культурнай пекнаты.
І сярод брытанцаў — one in (a) million —
тут жыве спадар Арнольд МакМілін.

Да стрэчы з табой

Да стрэчы з табой
я нікла журбой,
душа памірала
ад снежнае стыні.
Да стрэчы з табой
не стала сабой,
і дух мой скавала
зацятасці сіла.

Да стрэчы з табой
шумеў лістабой,
што я паміраю
дарэмна, дачасна.
Для стрэчы з табой
нябесны агонь
праклаў сцежку раю,
мілосці і шчасця.

***

Зіма, зіма! Мяне няма,
бо я знікаю без кахання.
Забойца — злосная гайня —
развее пыл з касцей да рання.

І буду думаць: ці ўскрасаць
у свеце гэтым шматпакутным
ці на нябёсах зоркай ззяць —
халоднай, велічнай і мудрай.

***

Кадр уявіла: бачу карты
пра тое, як, калі памру.
Тады адкіну, што няварта
і буду дзейсніць, чым гару.

Без веды гэтае сакральнай
размыты час, уроссып планы.
Здаецца, вечнасць, ты вітальна,
ды гэта сталасці падманы.

А смерць пільнуе зноў ахвяру.
А час ласо на ногі кіне.
Іду. Бягу. Працую. Мару.
І продкаў шчыт бароніць спіну.

Шчасце

Прадстаўлена яўна і сненнямі
і шчодрую мае прыроду.
Прыходзіць нясмела, імгненнямі
і дорыць душы асалоду.

Гаворыць мне: «Пі, я нявечнае,
я заўтра растану туманам».
Я ўдзячна, адкрыта, асвенчана,
яго святлом зачаравана.

Раманс

У паралельных сусветах
сэрцы сінхронна пульсуюць.
Пры віртуальных сустрэчах
музыку Вечнасці чуюць.

З вішань абодвух сусветаў
квецень злятае паволі.
Быццам накладзена вета
нам на спатканне і долю.

Вабіць шматзорная далеч.
Сонца згарае ў нябёсах.
На таямнічых скрыжалях
нашы запісаны лёсы.

Станіслава УМЕЦ

Конкурс «ПЕРШАЦВЕТ»

НА СКРЫЖАВАННІ СУСВЕТАЎ

Вы калі-небудзь чулі пра кавярню, у якой замест назвы — руна лёсу? Маленькая, не дужа самавітая з выгляду, яна прыхавалася на адной са сталічных вулачак. Нават ведаючы дакладны адрас, знайсці яе нялёгка. А Ліля знайшла. Выпадкова. Пачуўшы гэтае слова, гаспадыня кавярні, пажылая жанчына з фіялетавымі валасамі, узлавалася б не на жарт. Яна непахісна верыла ў лёс. Як і ўсе наведнікі кавярні. Яе заўсёднік пісьменнік М. Сон нават прысвяціў тэме лёсу цэлую кнігу. Галоўны герой — граф з XIX стагоддзя — загінуў ужо на першай старонцы, а на двухстах шасцідзесяці трох наступных тлумачылася лёсавызначальнасць гэтай падзеі.

— Уявіце сабе, што, каб не смерць графа шмат гадоў таму, сёння нас з вамі ўвогуле магло не быць, — загадкава казаў М. Сон кожнаму, хто наважваўся прачытаць ягоны раман.

Ліле кніга не спадабалася. Як і ніводная іншая з тых, што ляжалі ў стосіку ля касы. Але заняцца ў абед, калі дзяўчына сюды наведвалася па марозіва і кубачак кавы, усё адно не было чым — і яна працягвала чытанне. Сёння Ліля выбірала паміж дзвюма кнігамі — у блакітнай і зялёнай вокладках. Акурат у гэты час яна адчула на сябе пільны позірк і рэзка абярнулася. На яе глядзелі прыгожыя ізумрудныя вочы новага наведніка кавярні. Лілі падалося, быццам нешта абарвалася ўнутры. Яна схапіла адну з кніг і паспяшалася на ўлюбёнае месца ля акна, дзе яе ўжо чакала вазачка з шакаладным марозівам.

Дзяўчына паспрабавала ўцягнуцца ў чытанне, ды адчуванне, што за ёй назіраюць, не пакідала. Да таго ж яна раптам выявіла, якую кнігу з дзвюх выбрала: у зялёнай вокладцы. Зялёнай, як ягоныя вочы. Ліля адсунула яе ад сябе і страсянула галавой. Гэтая кавярня пад рунай лёсу была для дзяўчыны схованкай. За яе дзвярыма — вэрхал, хаос. А ўнутры — заўсёдашні парадак, утульнасць, спакой. І вось у гэты парадак уварваўся новы чалавек. Пакуль ён не паспеў перавярнуць тут усё дагары нагамі, Ліля, пакінуўшы грошы за марозіва, схапіла сумку ды плашч і збегла.

«Ты заўсёды бегаеш ад усяго новага. Баязліўка!» — аблаяла яна сябе і на другі дзень зноў прыйшла ў кавярню, замовіла шакаладнае марозіва і села ля акна. Усё было па-старому. Тыя ж самыя наведнікі на тых жа самых месцах. Як і заўжды. Раптам Лілі стала сумна, нават захацелася першы раз у жыцці нешта змяніць. Напрыклад, купіць замест шакаладнага марозіва клубнічнае. Ды гаспадыня кавярні ўжо прынесла ёй заказ. Уздыхнуўшы, дзяўчына ўзялася за ласунак, як раптам нехта побач звярнуўся да яе:

— Вы кожны раз бераце шакаладнае. Напэўна, вельмі смачнае. Можна пакаштаваць?

Гэта зноў быў ён, уладальнік прыгожых ізумрудных вачэй. Ліля разгубілася. Так, хвіліну таму ёй хацелася нешта змяніць у жыцці, яна нават гатовая была здрадзіць улюбёнаму марозіву, але падпусціць да сябе новага чалавека — гэта для яе было занадта.

— У мяне… няма другой лыжачкі… — прамармытала дзяўчына.

І тады адбылося тое, чаго Ліля ніяк не магла чакаць: ён нахіліўся і пацалаваў яе ў шакаладныя вусны. Ды раптам адхіснуўся, быццам ад поўхі, якую дзяўчына не паспела яму даць.

— Я думаў, што не змагу да вас дакрануцца!

— Але дакрануліся.

— Так, дакрануўся…

Абое з хвіліну маўчалі, гледзячы адно аднаму ў вочы. Нарэшце малады чалавек загаварыў:

— Дазвольце мне ўсё патлумачыць. Я фізік і астраном Ціт Сегінус. — Ён працягнуў руку для поціску.

— А я Ліля, — сказала дзяўчына і перапытала: — Сегінус — як зорка?

— Так, як зорка, — пацвердзіў Ціт. — Я шмат гадоў шукаў гэтае месца…

— Кавярню?!

— Гэта не проста кавярня! — Ягоныя вочы загарэліся. — Гэта скрыжаванне сусветаў!

Вядома ж, Ліля яму не паверыла. Вар'ят нейкі. Але такі прывабны! Пакуль Ціт Сегінус нешта ёй даводзіў, яна сачыла за ямачкай, якая то з'яўлялася, то знікала на ягонай шчацэ, за дужкамі брывоў, якія то ўзляталі, то выгіналіся, то сыходзіліся на пераноссі, за эмацыйнымі рухамі ягоных рук. Ён быў жывы — залішне жывы для гэтай ціхамірнай кавярні і для яе, Лілі, заўсёды такой стрыманай і рахманай. Гэта і палохала, і вабіла.

— Вы не слухаеце мяне! — усклікнуў Ціт. — Хадземце са мной. Зараз жа хадземце!

Малады чалавек схапіў дзяўчыну за руку і пацягнуў да выхаду. І, як толькі яны апынуліся за дзвярыма, ён… знік. Ліля нават перажагналася: Ціт Сегінус нейкім дзіўным чынам растаў.

Апрытомнеўшы, дзяўчына вярнулася ў кавярню і села ля акна. Праз хвіліну нехта дакрануўся да яе пляча. А яна ўжо была спалохалася, што Ціт не вернецца.

— Ну што, цяпер ты мне верыш? — Ён незаўважна перайшоў на «ты».

— Цяпер веру, — няўпэўнена адказала дзяўчына.

Так, цяпер Ліля яму верыла. Яна больш не лічыла яго звар'яцелым навукоўцам. А кавярня раптам падалася ёй дужа містычным месцам. Дзяўчына ўбачыла тое, чаго не заўважала раней: што вокны заўсёды былі шчыльна завешаныя фіранкамі, і што стрэлка на гадзінніку рухалася ненатуральна павольна, і што тут зусім не лавіла мабільная сетка. Ліля раптам зразумела, чаму яны з Цітам апынуліся ў гэтай кавярні. «Нам было наканавана сустрэцца», — з усмешкай падумала яна.

— Ну выкладвай, як яго завуць, дзе пазнаёміліся? — засакатала калега ў вялізных акулярах-стракозах, калі Ліля вярнулася ў офіс. — Ведаю я гэты твой загадкава-задуменны выраз твару!.. Калі ты нам яго пакажаш?!

Дзяўчына толькі пацепнула плячыма і схавалася за стосам папер. «Ніколі», — хацела яна сказаць, ды не здолела вымавіць гэтае халоднае слова.

— Калі-небудзь, — суцешыў яе назаўтра Ціт Сегінус. — Мы абавязкова будзем разам! Ты мне верыш?..

Яны сядзелі за столікам у куце кавярні і трымаліся за рукі. Стрэлка гадзінніка рухалася марудна, ды часу ўсё адно не ставала — каб нагаварыцца, наглядзецца, намілавацца.

Ліля з дня ў дзень жыла ад абеду да абеду. Пакуль лёс не згуляў з ёю злы жарт: офіс пераехаў у іншы будынак на другі канец горада. Цяпер яны з Цітам маглі бачыцца толькі на выхадныя.

— Слухай, Лілька, на цябе тут адзін хлопец вока мае, — прашчабятала аднойчы калега ў вялізных акулярах-стракозах. — Камп'ютаршчык, на трэцім паверсе працуе. Ты схадзі з ім на спатканне, га? Хопіць ужо пра нейкага выдуманага прынца марыць.

Каб калега адчапілася, Ліля пагадзілася сустрэцца з таемным паклоннікам і нечакана для сябе даволі весела прабавіла з ім час. Ён быў не зорным прынцам з іншага сусвету, а звычайным камп'ютаршчыкам, простым прыязным хлопцам з трэцяга паверха офіса. І ён быў… рэальным. Ім не трэба было ўвесь час хавацца ў кавярні. Яны маглі цешыцца сонейкам на лаўцы ў парку, танцаваць пад дажджом, скакаць па лужынах… Маглі. Але не цешыліся, і не танцавалі, і не скакалі.

— А ты верыш у лёс? — неяк спытала Ліля, праз сілу пхаючы ў сябе нясмачнае шакаладнае марозіва ў нейкай забягалаўцы, куды прывёў яе кавалер.

— Што за глупствы! Жартуеш?! — чмыхнуў ён. — Лепей еш марозіва, яно тут вельмі смачнае. Згодная?

Не, Ліля не была згодная. Усё ўнутры бунтавала. «Што я нарабіла?!» — падумала дзяўчына і, паспешліва развітаўшыся, збегла. Яна памчала на другі канец горада. Была нядзеля. Ліля адчайна спадзявалася, што, хоць мінуў ужо цэлы месяц, Ціт Сегінус усё адно будзе яе чакаць. Але чакалі дзяўчыну расчараванне, гаркота і жаль. Руна згасла. Больш не было кавярні. Больш не было скрыжавання сусветаў…

***

— Мамачка, а раскажы мне, калі ласачка, зноў пра зорнага прынца, — прамуркала дзяўчынка.

Ліля захутала дачку коўдрай і, сеўшы побач на краёк ложка, напаўголасу пачала апавядаць:

— Звалі яго Ціт Сегінус, і жыў ён у іншым сусвеце, на далёкай і вельмі прыгожай планеце… Быў ён, як і ўсе прынцы, дужа прывабны, спагадлівы, добры і шчыры сэрцам. І вось аднойчы трапіў Ціт у надзвычайнае месца — у чароўную кавярню пад рунаю лёсу. А ведаеш, чаму яна была чароўнай? Бо ў ёй скрыжоўваліся сусветы! А сусветаў было незлічонае мноства… І зайшла неяк у кавярню наша зямная прынцэса па імені…

— Ліля, — падказала дзяўчынка.

— Хіба я прынцэса? — здзівілася маці.

— Мамачка, ты ў мяне самая сапраўдная прынцэса! — заўсміхалася дачка.

— Ну добра, няхай будзе Ліля. Дык слухай, што было далей… Замовіла яна шакаладнае марозіва, села ля акна і раптам адчула на сабе нечы позірк. Азірнулася і ўбачыла неймавернай прыгажосці ізумрудныя вочы Ціта Сегінуса. А пасля адбылося самае цікавае — ён падышоў да яе і… пацалаваў. Прынц, як толькі ўбачыў Лілю, адразу ж зразумеў, што ім з ёю лёсам наканавана быць разам…

— А далей, што далей?

— А далей… жылі яны доўга і шчасліва! — Маці ўздыхнула.

— Мамачка, а ці сапраўды існуе гэтая чароўная кавярня? — пацікавілася дзяўчынка.

— Калісьці існавала, — пацвердзіла Ліля.

— І ты яе бачыла?

— Бачыла. І нават ела самае смачнае ў свеце марозіва!

— Тады я знайду яе і таксама пакаштую марозіва, — вырашыла дзяўчынка.

— Добра, сонейка маё, калі-небудзь абавязкова знойдзеш, а пакуль заплюшчвай вочкі. — Маці пацалавала дачку ў лоб. — Добрай ночы!..

***

За тыдзень Адэля праплакала ўсе вочы. У яе дзявочым жыцці ўпершыню здарылася непапраўнае гора: яна рассталася з каханым. Звяртацца да маці па параду Адэля не захацела, бо ведала, што тая ўсё вытлумачыць лёсам. А дзяўчынка цяпер была неймаверна на яго ўзлаваная.

У дзяцінстве, калі Адэля журылася, маці заўсёды частавала яе шакаладным марозівам. Спадзеючыся, што ласунак і гэтым разам дапаможа ёй супакоіцца, дзяўчынка зайшла ў маленькую несамавітую кавярню, у якой замест назвы прамянілася руна.

Унутры было даволі ўтульна і светла, хоць вокны былі шчыльна завешаныя фіранкамі. На сцяне вісеў гадзіннік, і ягоная стрэлка рухалася ненатуральна павольна. Ля касы ляжаў стосік кніг, верхняя была аўтарства нейкага М. Сона і называлася «Лёс як вечная субстанцыя».

— Усюды гэты лёс, каб на яго ліха! — не вытрымала Адэля.

Наведнікі кавярні гучна ахнулі.

— Што вы сказалі? — З-за вітрыны з марозівам вызірнуў гаспадар.

Гэтым разам ахнула Адэля. Ізумрудныя вочы мужчыны нагадалі дзяўчынцы казкі, якія калісьці распавядала ёй маці. Яна мімаволі спытала:

— Ціт Сегінус?

— Ліля? — ледзь чутна прамовіў гаспадар кавярні.

— Адэля, — сказала дзяўчынка. — Ліля — гэта мая матуля. Я да яе вельмі падобная…

Ціт Сегінус доўга стаяў нерухома і моўчкі глядзеў на дачку каханай жанчыны. І раптам усміхнуўся, цёпла і шчыра, — і ў куточках ягоных прыгожых вачэй бліснулі слязінкі. Юнае Адэліна сэрца ажно затрымцела ад замілавання, і яна выбегла з кавярні, каб патэлефанаваць маці. Столькі часу гэты прывабны самавіты мужчына чакаў сустрэчы з ёю! І нарэшце дачакаўся…

Забыўшыся на свае гады, Ліля бегла, як некалі ў маладосці, уздоўж адной са сталічных вулачак. Агарнуўшае яе шчасце разгладзіла зморшчынкі на твары і надало целу лёгкасці і зграбнасці. Жанчына спяшалася насустрач наканаванаму лёсам ды гэтак недарэчна страчанаму калісьці каханню.

Адэля села за столік у куце і неўзабаве ўбачыла, як упырхнулая ў кавярню маці расчулілася ў гарачых абдымках свайго зорнага прынца. І першы раз за доўгі час дзяўчынка заўсміхалася. Яна сцягнула са стосіка ля касы кнігу М. Сона, на якую зусім нядаўны варожа касавурылася, і ўзялася за чытанне, ласуючыся самым смачным у свеце шакаладным марозівам.

Захоўваем традыцыі

Быць добрай гаспадыняй заўсёды было справай складанай і пачэснай адначасова. Ідуць стагоддзі, пашыраецца сфера дзейнасці жанчын, але, здаецца, назаўсёды жанчына застанецца ахоўніцай хатняга агменю. З пакалення ў пакаленне жанчыны перадаюць сакрэты ўладкавання хатняй гаспадаркі, рэцэпты страў, схемы вышыўкі. Увазе чытача прадстаўлены тры кнігі выдавецтва «Беларусь», якія зацікавяць не толькі дбайных гаспадынь, але і ўсіх, хто цікавіцца беларускай культурай, народнымі традыцыямі.



Фота Кастуся Дробава.

«ЛІТОЎСКАЯ ГАСПАДЫНЯ. ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАСПАДАРЧА-КУЛІНАРНАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»

Знакамітая кніга, якая ўпершыню пабачыла свет у 1848 годзе, зноў з'явілася на паліцах беларускіх кнігарняў. Кагосьці здзівіць назва, але прычына вось у чым: у кнізе прадстаўлены гаспадарча-кулінарны досвед жыхароў Міншчыны, якая некалі ўваходзіла ў склад Вялікага Княства Літоўскага. Продкаў жа цяперашніх літоўцаў у дзевятнаццатым стагоддзі называлі пераважна жмудзінамі.

Аўтарства кнігі нідзе не пазначаецца згодна з воляй аўтаркі. Усе выданні «Літоўскай гаспадыні» (а іх дагэтуль было шэсць) ананімныя. Гэта невыпадкова, бо ў сярэдзіне XIX стагоддзя пісьменніцтва для жанчыны было справай вельмі экстравагантнай. Але дзякуючы даследаванням атрымалася высветліць дакладна, што кнігу напісала Ганна Цюндзявіцкая, пра якую вядома не так шмат. Абапіралася яна не на чужыя крыніцы, хоць і выкарыстоўвала іх, а на ўласны досвед. Няма сумненняў, што аўтарка вяла вялікую гаспадарку. Аўтар прадмовы да новага выдання 2017 года Адам Мальдзіс упэўнены, што веды Ганны Цюндзявіцкай былі энцыклапедычныя, бо ў кнізе яна выкарыстала рускія, украінскія і польскія крыніцы, а побач з мясцовымі назвамі раслін прывяла лацінскія.

Аўтарка пісала не толькі пра жаночую, але і пра мужчынскую гаспадарку. Галоўная мэта выдання — дапамагчы жанчынам у цяжкіх клопатах. Таму Ганна Цюндзявіцкая распавядала пра ўтрыманне кароў і валоў, пра захоўванне вяндліны і саленне розных відаў мяса і рыбы, пра малочныя прадукты, выраб масла і сыроў, пра касметыку і духмяныя рэчывы ды пра многае іншае, пра што сучасны чытач нават не здагадваецца. Кніга зацікавіць прадпрымальнікаў, гісторыкаў, культуролагаў і цікаўных, якім неабыякава мінулае.

«СЛАВЯНСКАЯ ВЫШИВКА КРЕСТОМ»

У старажытны час вышыўка мела ў першую чаргу ахоўнае значэнне. Але цяпер галоўная роля гэтага віду рукадзелля дэкаратыўная. У выданні прадстаўлены работы майстра народнай творчасці па вышыўцы крыжом Ады Раманоўскай: абрусы, ручнікі, сурвэткі, навалачкі. У большасці вышывак выкарыстоўваюцца традыцыйныя чорны і чырвоны колеры. Дадзены фотаздымкі, схемы, апісанне работы. Для гаспадынь, якія захапляюцца вышыўкай і цікавяцца народнымі традыцыямі, кніга Ады Мікалаеўны будзе выдатнай знаходкай. Любоў да вышыўкі майстрыха пераняла ад сваёй бабулі, сабрала шмат схем і ўзораў.

«БЕЛАРУСКАЯ КУХНЯ»

Гэта выданне заснавана на працы этнографа Мікалая Нікіфароўскага «Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности» і распавядае ў першую чаргу пра кулінарныя традыцыі Віцебшчыны. Канкрэтных рэцэптаў Нікіфароўскі не запісваў, таму аўтар выдання — Аляксандр Вашчанка — сам збіраў рэцэпты, карыстаючыся інфармацыяй з кніг і падказкамі знаёмых. Усе рэцэпты дадзены з каментарыямі аўтара, упрыгожаны фотаздымкамі і пададзены на трох мовах: беларускай, рускай і англійскай.

Назвы раздзелаў, прысвечаных пэўнай страве, — вядомыя беларускія прыказкі. Напрыклад, «Без капусты жываты пусты» ці «Каб рыбу есці, трэба ў ваду лезці». З кнігі можна даведацца пра побыт, традыцыі, гаспадарку нашых продкаў, прычым пададзены нарысы Аляксандра Вашчанкі проста і цікава.

У прадмове аўтар адзначае, што кожная гаспадыня можа прыгатаваць салат «Цэзар», а зрабіць студзень, кулагу, камы — справа іншая. Беларусаў называюць «бульбашамі», але бульба ўжываецца на Беларусі крыху больш за два стагоддзі. Традыцыі забываюцца, людзі шмат пераядаюць, харчуюцца часта няправільна. Кніга заклікае звярнуць увагу на самабытнасць беларускай кухні, захаваць яе адметнасць.

Калатуха, капытка беларуская, таўчонікі, цымес з морквы — усе гэтыя апетытныя стравы з задавальненнем пакаштуюць сучасныя беларусы. А на святочны стол, паводле даўніх традыцый, можна паставіць крамбамбулю, медавуху вясновую альбо лікёр з руж. Прыгатаваць гэтыя напоі зусім не складана. Вядома, рэцэпт — не жорсткае правіла. У кулінарыі заўсёды ёсць месца эксперыменту!

Яўгенія ШЫЦЬКА

Вытокі

«Крыніца» ставіць на крыло

Членам гэтага літаб'яднання была будучы нобелеўскі лаўрэат

Бяроза — старажытны горад над рэчкай Ясельдай — адзначыў сёлета 540-годдзе. З гэтай нагоды мясцовы гісторыка-краязнаўчы музей на чале з дырэктарам Любоўю Ківатыцкай рэалізоўвае культурна-асветніцкі праект «Горад у панараме стагоддзяў».

Адзін з вечароў пад назваю «Дзе слова шукае Слова, а чалавек — Чалавека» быў прымеркаваны да важкай падзеі ў духоўна-культурным жыцці горада — 50-годдзя літаратурнага аб'яднання «Крыніца», створанага ў 1967 годзе пры рэдакцыі раённай газеты, якая тады называлася «Маяк коммунизма».

Цікавае дзейства ажывіла змястоўная выстаўка «Радзіма — творчасці калыска і крыніца» ў «Галерэі мастацтваў» — філіяле музея. Экспазіцыя, зладжаная менавіта да гэтай падзеі, прадставіла наведвальнікам і гасцям вечара многіх таленавітых творцаў у сферы літаратуры. Бярозаўская зямля ўзгадавала такіх вядомых сёння ў Беларусі майстроў самабытнага паэтычнага і празаічнага слова, як Алесь Разанаў, Ніна Мацяш (у памяць пра яе кожны верасень ладзяцца сустрэчы ў Белаазёрску), Мікола Арахоўскі, Раіса Баравікова, Віктар Супрунчук, Зінаіда Дудзюк, Васіль Сахарчук, Анатоль Казловіч, Міхаіл Шыманскі, Андрэй Юдчыц. Усе яны — першыя птушкі выраю, крылы якому дало літаратурнае аб'яднанне «Крыніца». Багатую біяграфію літаб'яднання, яго творчыя здабыткі праз 50 гадоў раскрываюць разнастайныя матэрыялы: рукапісы, кнігі аўтараў-землякоў з дарчымі подпісамі, фотаздымкі, пісьмы, уласныя рэчы творцаў… Саму ж экспазіцыю ўпрыгожылі карціны з птушыных пёркаў, створаныя ў тэхніцы «пёркаграфія» паэткай, берагіняй слова з горада Белаазёрска Нінай Мацяш, і мастацкія палотны драматурга Міколы Арахоўскага, ураджэнца вёскі Сялец.

Шчодра падзяліўся ўласным архівам былы кіраўнік «Крыніцы» Яўген Сяленя, які гэтую грамадскую працу сумяшчаў з пасадай рэдактара райгазеты і па-бацькоўску апякаў пачаткоўцаў, дапамагаў ім паверыць у свае сілы. Яўген Васільевіч, аўтар некалькіх кніг пра Бярозу, адзін з членаў рэдкалегіі пры выданні кнігі-хронікі «Память. Берёзовский район», ганаровы грамадзянін горада Бярозы, можа шмат распавесці пра «крынічан» 70 — 80-х гадоў мінулага стагоддзя, пра незабыўныя сустрэчы ўлетку 1972 года з народнымі пісьменнікамі Беларусі Максімам Танкам і Андрэем Макаёнкам, рэжысёрам Маскоўскага тэатра сатыры Валянцінам Плучэкам. Дарэчы, ёсць сярод былых членаў «Крыніцы» лаўрэаты нацыянальных і міжнародных прэмій, творы якіх перакладзены на дзясяткі моў розных народаў, уключаны ў школьныя праграмы. І, вядома, мясцовыя творцы ганарацца тым, што былая ўдзельніца літаб'яднання, нобелеўскі лаўрэат Святлана Алексіевіч працавала ў 70-я гады загадчыкам аддзела пісем бярозаўскай «раёнкі».

Адказная за выпуск сённяшняй літаратурнай старонкі «Крыніца» ў газеце «Маяк», загадчык аддзела сацыяльных праблем Маргарыта Гаравая лічыць, што «Крыніца» двухтысячных не адчувае адтоку творчых сіл: штомесяц на літстаронцы публікуюцца новыя творы і «крынічан», і аўтараў-пачаткоўцаў, сярод якіх — Уладзімір Сіпягін, Аксана Валуй, Алёна Папко, Людміла Гайчук, Лілія Зінкевіч, Максім Гансецкі, Ігар Шарай. Актыўна супрацоўнічаюць з літаратурнай старонкай Марыя Сцяфанава, Валянціна Осіпава, Алена Усцілоўская-Казловіч.

Удзельнік тэатра слова, вучань СШ № 3 г. Бярозы Глеб Казлоў чытае Алеся Разанава.

Сутнасць літаратурных сустрэч на Бярозаўшчыне вызначае радок з пункціраў стваральніка новых літаратурных форм Алеся Разанава: «Я ў крузе, дзе слова шукае Слова, а чалавек — Чалавека». Утульна адчувае сябе ў крузе аматараў паэзіі вядомы ў горадзе чалавек, настаўнік беларускай мовы і літаратуры, дырэктар бярозаўскай сярэдняй школы № 1 Мікалай Жуковіч. Яму прысвяцілі відэапрэзентацыю, якая распавядае пра тое, як настаўнік і яго выхаванцы збіраюць матэрыял пра жыццё і літаратурную дзейнасць пісьменнікаў-землякоў, вывучаюць і папулярызуюць іх творчасць.

Ала ДРАГАН

«ЗЯЛЁНАЯ» ФІЛАСОФІЯ

Беларуская дуда і слімакі на экафестывалі

«Экалагічнае» свята завітала да Ірыны і Міхаіла Макеяў, гаспадароў аграсядзібы «Верас», што ў Зэльвенскім раёне Гродзенскай вобласці. Менавіта гэтае месца абралі для экафестывалю «*Organic party*», ці, як пераклалі назву арганізатары, «Зялёнай гулянкі». Гэта адно з мерапрыемстваў праекта БАА «Адпачынак у вёсцы», арганізаванае разам з Зэльвенскім райвыканкамам, Беларускім саюзам дызайнераў і грамадскай арганізацыяй «Школа маладога фермера».

— Яшчэ 26 гадоў таму на месцы сядзібы не было нічога, толькі балота. Але ў гаспадароў было вялікае жаданне нешта тут стварыць. І зараз я шчаслівая, што мы можам ладзіць нашу «гулянку» менавіта тут, — паведаміла старшыня арганізацыі «Адпачынак у вёсцы» Валерыя Кліцунова.

Між іншым у 2016 годзе сядзіба «Верас» атрымала Гран-пры рэспубліканскага конкурсу на лепшую аграсядзібу Беларусі. І нядзіўна. «Верас» — першая ў краіне сядзібна-фермерская гаспадарка і сёння адна з самых буйных сядзіб Беларусі. І сапраўды, цалкам абысці ўсю тэрыторыю «Вераса» даволі цяжка. Шмат у чым з-за таго, што на кожным кроку сустракаюцца нейкія цуды. Ідзеш — і абавязкова на шляху сустрэнеш некалькі паўлінаў ці цацарак. Ці спецыяльна абіраеш месца, каб не раздушыць маленькія грыбочкі, што растуць на тэрыторыі сядзібы. Тут і велізарны дэндрапарк, у якім больш за 250 відаў і разнавіднасцяў дрэў і хмызнякоў. За некалькі кіламетраў ад сядзібы — Сынкавіцкая царква-крэпасць, якая менавіта ў дзень «Зялёнай гулянкі», 16 верасня, адзначыла 610-годдзе з дня заснавання.

«Зялёнай» гулянка стала з-за таго, што, калі кажуць «арганік» або «эка», уяўляюць менавіта зялёны колер. Задача фестывалю — у тым, каб растлумачыць, што арганічная «зялёная» філасофія — гэта і беражлівае стаўленне да наваколля, і адмова ад бесперапыннага спажывання, і павага да традыцый.

Аграсядзіба «Верас».

На фестывалі працавала некалькі секцый. Секцыя «*Organic-art*» прэзентавала працы беларускіх дызайнераў, удзельнікаў пленэру, якія прадставілі свае інсталяцыі з прыродных матэрыялаў — саломы, сена, гародніны-садавіны, лазы. У гэтай жа секцыі адкрылі парк скульптур або арт-прасторы. «Рамесны падворак» зладзіў кірмаш рамеснікаў і аграсядзіб. Дарэчы, у госці на «Зялёную гулянку» завіталі прадстаўнікі шматлікіх іншых беларускіх сядзіб: «Студзінкі», «Нясвіжскай», «Прыазёрнай», «За масточкам». «Экаежа» прадставіла прадукцыю фермерскіх гаспадарак і турыстычных кластараў. Бралі ўдзел у «гулянцы» фермерскія гаспадаркі «Вілія-Агра», «Валожынскія гасцінцы», «Водар Белавежжа», «Ратаў».

У секцыі «Універсітэт зялёнай філасофіі» арганізавалі галоўную і пазнавальную праграму. Тут госці наведвалі прэзентацыю кнігі «Сакатала бочачка» беларускага гісторыка, публіцыста, культуролага і гаспадара аграсядзібы «Брама ў Налібокі» Алеся Белага. Даведаліся пра рэгіянальны кулінарны конкурс у Ваўкавыскім раёне, пра які расказваў Яўген Красноўскі, гаспадар аграсядзібы «Альхова». Слухалі дуду і скрыпку на музычнай лекцыі «Ад дуды да скрыпкі: пазнаем саміх сябе», якую ладзіў Алесь Лось, гаспадар сядзібы «Хутар Дудара».

Разыначкай фестывалю сталі беларускія слімакі, якіх прыгатаваў Вячаслаў Гарбатаў, адзін з вядомых беларускіх шэф-кухараў. Магчымасць пакаштаваць яшчэ нязвыклую для Беларусі страву была ва ўсіх гасцей фестывалю. Падавалі слімакоў разам з багетам і арганічным віном, якое падбіралася спецыяльна для «экалагічнага» свята. Афіцэр ордэна сельскагаспадарчых заслуг Францыі і кіраўнік арганізацыі «Франс груп» Яўгенія Бунас паведаміла пра арганічнае фермерства на лекцыі «*Agriculture* у Францыі і Беларусі: ад фермерскага вырабу да развіцця экспарту»:

— Акрамя тэхналагічных рашэнняў у сферы сельскай гаспадаркі, мая роля заключаецца ў тым, каб з такіх незвычайных прадуктаў, як слімакі, ствараць рэгіянальную гісторыю Беларусі. Яе змогуць ацаніць як беларускія жыхары (у нас насамрэч ёсць вялікая колькасць аматараў арыгінальнай кухні), так і нашы замежныя госці. Мы ствараем імідж нашай краіны: ні адно мерапрыемства ў Францыі, на якім мы можам прапанаваць французам адпачынак у Беларусі, не абыходзіцца без удзелу нашай арганізацыі.

Валерыя Кліцунова нагадала, што першая «Зялёная гулянка» ладзілася ў 2014 годзе, і выказала спадзеў, што з гэтага моманту фестываль будзе арганізоўвацца як мага часцей. У гэтым і мэта — паказаць, наколькі правільным, карысным і арганічным можа быць адпачынак у вёсцы, прыцягнуць да сельскага адпачынку гарадскога жыхара. Бо аграэкатурызм — цудоўная магчымасць быць у гармоніі з прыродай. Яшчэ гэта магчымасць пазнаёміцца з традыцыйным побытам, рамёствамі, фальклорам, кухняй. І, мабыць, самае галоўнае — магчымасць зносін з мясцовым насельніцтвам, якое застаецца носьбітам беларускай культуры.

Ксенія ВЯДЗМЕДЗЬ

Чароўная Беларусь

КУФАР

Ніколі не здзіўляўся, што наш дзядуля заўсёды спіць на куфры. Гэта было так звычайна, як і тое, што гаршэчнікі стаяць ля печы, дзве лавы — за сталом, а абразы з суровымі лікамі святых — у куце пад столлю. Гэта было так звычайна, што каб хтосьці з хатніх убачыў старога ў другім месцы, напрыклад, на палацях, якія былі побач з куфрам, то ўсе адразу сталі б дакучаць: чаму на палацях, а не на куфры?

І яшчэ я не памятаю, каб маці зганяла дзеда з куфра, калі ёй было нешта ад яго патрэбна: кашуля для бацькі ці абрус на стол. Яна нават не падавала выгляду, што ёй трэба зазірнуць у куфар. Яна проста ціха чакала, калі дзядуля насуне шэрыя валёнкі ды пойдзе з хаты, нешта гаворачы сабе пад нос.

Я таксама чакаў гэтага моманту, бо ўсё, што было вакол мяне ў хаце, ведаў да дробязей. З заплюшчанымі вачыма мог паказаць, дзе што ляжыць, дзе што схавана. Як, напрыклад, жалезная скрынка, мабыць, з-пад цукерак, у якой дзед і бацька трымалі свае ўзнагароды, нейкія паперы ды некалькі срэбных бляшак з выявамі невядомых мне птушак. І як толькі я заставаўся ў хаце адзін — пажадана надоўга, — даставаў тую «скарбонку» і павольна перабіраў «цацкі», разглядаючы іх з усіх бакоў, а потым складваў так, як яны ляжалі дагэтуль, каб дарослыя не заўважылі і не здагадаліся…

А вось куфар — справа іншая. Тое, што знаходзілася пад цяжкай, абабітай меднымі стужкамі накрыўкай, было, калі так сказаць, маёмасцю маці. Толькі яна гаспадарыла ў куфры! Усё, што там ляжала, выткала-пашыла сама матуля, а нешта засталося ад бабулі, якую я памятаю цьмяна.

Прыгожыя ручнікі, сурвэткі, абрусы і дзяругі розных колераў ды ўзораў, у якіх можна было разгледзець дзівосныя арнаменты ці нават фантастычныя карціны з птушкамі і жывёламі, і шмат чаго іншага было яшчэ ў нашым куфры. Хаця ў хаце вісела шмат вышывак, але і ў куфры іх мелася яшчэ з дзясятак.

Ляжалі ў куфры яшчэ ёлачныя цацкі. Цікава было ўбачыць іх, напрыклад, вясной ці ўлетку. За час пасля зімовых святаў трохі забывалася, якія яны незвычайныя, казачныя, рукі так і цягнуліся, каб дакрануцца. У невялічкай шуфлядзе зберагаліся розныя пацеркі ды завушніцы, каляровыя матузы ды стужкі ў клубочках. У чырвонай каробцы былі складзеныя ў некалькі разоў жоўтыя паперы з намаляванымі на іх рознакаляровымі вензелямі ды гербамі. У другой кардонавай каробцы знаходзілася незлічоная колькасць розных напарсткаў, кручкоў і гузікаў. Там жа побач былі невялікія абразы і тоўстыя кніжкі ў скураных вокладках.

Яшчэ ў куфры захоўвалася вельмі цікавая для мяне рэч — вялікіх памераў альбом з фотаздымкамі, такі цяжкі, што калі давалі мне яго паглядзець (абавязкова ў прысутнасці бацькоў ці дзеда), то клалі на калені. Праз нейкі час вельмі хацелася яго зняць і перанесці на стол ці палажыць на лаву, каб глядзець далей.

Калі матуля трохі замаруджвалася, у мяне хапала часу разгледзець усё, нават нешта пачапаць пальцамі. У гэтыя імгненні я быццам апынаўся ў нейкім чароўным, невядомым свеце.

І вось неўзабаве ўсё вярталася на свае месцы. Накрыўка куфра цяжка апускалася, а дзед, які толькі што вярнуўся са двара, трос па чарзе нагамі, скідваючы валёнкі, і, вохкаючы, забіраўся на сваю звыклую ляжанку і накрываўся коўдрай з каляровых ласкутоў, якая была настолькі вялізнай, што хавала пад сабой і нашага дзядульку, і амаль увесь куфар.

Уладзімір ЦВІРКА,
фота аўтара

З нагоды

«А так спеўна, дудка міла»

Пад такою назваю ўрачыста адкрылася выстаўка з фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа ў музеі Уладзіслава Бранеўскага (філіял польскага Літаратурнага музея імя Адама Міцкевіча ў г. Варшаве). Экспазіцыя прысвечана 135-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі, біяграфія якога багата на шматлікія сувязі з прадстаўнікамі іншых літаратур.

З ранняга ўзросту дзякуючы бацькам Якуб Колас быў знаёмы з творамі розных пісьменнікаў, але асаблівай пашанай карыстаўся Адам Міцкевіч, невялікі графічны партрэт якога, як сведчанне павагі да вялікага польскага паэта, вісеў у хаце будучага песняра. Пазней Якуб Колас пісаў: «Адам Міцкевіч адзін з геніяльных славянскіх паэтаў. Па ахопу ўсеабдымнага таленту, па яго шырыні Адам Міцкевіч справядліва займае адно з першых месцаў сярод паэтаў-геніяў». Родныя паэта, як і ён сам, высока цанілі і любілі творчасць Марыі Канапніцкай, Генрыка Сянкевіча, у прыватнасці яго навелу «Янка-Музыкант», захапляліся творамі Уладзіслава Сыракомлі.

Дзякуючы Станіславу Фурманіку і Зофіі Русінскай, яшчэ ў 50-х гадах мінулага стагоддзя польскі чытач змог пазнаёміцца з аповесцямі Якуба Коласа «У палескай глушы» і «Дрыгва», з паэтычнымі творамі ў зборніку «А так спявае дудка міла» *(A tak śpiewa dudka miła)* у перакладзе Тадэвуша і Дароты Хрусцялеўскіх, Бажэны Клёг-Гагалеўскай.

Прадстаўленыя ў экспазіцыі матэрыялы знаёмяць з жыццём і творчасцю геніяльнага мастака слова, заснавальніка новай беларускай літаратуры. Асобны раздзел прысвечаны сувязям песняра з польскімі пісьменнікамі. Творчыя кантакты аб'ядноўвалі Якуба Коласа і Уладзіслава Бранеўскага, вядомага прадстаўніка польскай літаратуры.

Якуб Колас праявіў сябе і як таленавіты перакладчык, здольны захаваць пры перастварэннях асаблівасці стылю пісьменнікаў іншых літаратур. На выстаўцы прадстаўлены верш Адама Міцкевіча «Паніч і дзяўчына», пераклад якога на беларускую мову зрабіў Якуб Колас. Не застануцца па-за ўвагай наведвальнікаў і ўрыўкі са знакамітай паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» (пераклад на польскую мову Чэслава Сенюха, ілюстрацыі — народнага мастака Беларусі Васіля Шаранговіча).

Міра ІЎКОВІЧ

СВЯТА ЗНОСІН

Глядзець на мастацтва шырока расплюшчанымі вачыма прапануе галерэя «Універсітэт культуры»

Апошнім часам у Мінску з'яўляюцца новыя выставачныя пляцоўкі, якія спрабуюць захапіць і прыцягнуць наведнікаў арыгінальнымі мастацкімі праектамі. Пэўныя галерэі зацікаўліваюць інтэр'ерам, у які выйгрышна ўпісваюцца мастацкія творы, ёсць арт-пляцоўкі, якія арыентуюцца толькі на імёны-брэнды айчыннага мастацтва. Мастацкая галерэя «Універсітэт культуры», якой, дарэчы, сёлета спаўняецца пятнаццаць год, актыўна працуе з прадстаўнікамі розных кірункаў творчасці. За апошнія два гады галерэя набыла папулярнасць у гледача: прадстаўнікі айчыннай арт-супольнасці збіраюцца тут, у цэнтры сталіцы, не толькі, каб паглядзець новую выстаўку, але і каб пагутарыць. Як атрымалася прыцягнуць аўдыторыю і чым жыве арт-пляцоўка, расказаў дырэктар галерэі Павел Сапоцька.

— Павел Міхайлавіч, галерэя «Універсітэт культуры» за апошнія два гады стала адной з самых папулярных арт-пляцовак сталіцы. Як у вас атрымалася дасягнуць такога поспеху?

— Любы кіраўнік, як і любы супрацоўнік установы культуры, у дадзеным выпадку галерэі, павінен шчыра любіць працу, якой займаецца. І гэта першая ўмова, дзякуючы якой ажыццяўляецца любая дзейнасць. Другая ўмова — неабходна ўсведамляць патрэбу грамадства ў праектах, праграмах, выстаўках, іншых сацыяльна-культурных мерапрыемствах, якія сапраўды запатрабаваныя, цікавыя і могуць вырашаць пэўныя задачы. Трэба ставіць мэту і ісці да яе: займацца папулярызацыяй нацыянальнай традыцыйнай беларускай культуры, трансляцыяй творчых магчымасцяў, патэнцыялу адоранай таленавітай моладзі, знаёміць з досведам вядучых дзеячаў сферы культуры і мастацтваў Беларусі.

Кожным сваім праектам мы стараемся вырашыць пэўную задачу — адкрыць новае імя, магчыма, нагадаць пра імёны забытых мастакоў, дапамагчы пераняць досвед старэйшых пакаленняў малодшым. У нас неаднаразова нараджаліся ідэі выставак, якія потым трансфармаваліся ў маштабныя праграмы. Напрыклад, праграма «Беларускія таленты ў свеце».

Трэцяя ўмова, дзякуючы якой атрымліваецца зрабіць працу больш эфектыўнай, — кіраўнік павінен усведамляць і разумець, што кожная секунда працоўнага часу, кожны квадратны метр (у нашым выпадку выставачнай прасторы) павінен прыносіць карысць і рабіць унёсак у папулярызацыю нашай вышэйшай навучальнай установы, у прапаганду беларускай культуры, развіццё культурных сувязяў. У дадзеным выпадку можна казаць пра міжкультурны дыялог, пра творчыя кантакты, якія завязваюцца на базе нашай галерэі. Для мяне вялікае шчасце, калі знаёмства гасцей прыводзіць да новых арыгінальных праектаў. І гэта таксама немалаважная функцыя галерэі. Кожнае мерапрыемства павінна ператварацца ў свята зносін. Менавіта таму мы часам выходзім за межы выставачных праектаў і стараемся практыкаваць музычна-літаратурныя вечары, прэзентацыі, творчыя сустрэчы, вечарыны памяці.

— У Мінску апошнім часам адкрываецца ўсё больш цікавых галерэй і розных арт-прастор. Наколькі адчуваецца канкурэнцыя і як яна адлюстроўваецца ў галерэйнай справе?

— Сапраўды, канкурэнцыя апошнім часам адчуваецца моцна. І змагацца з гэтым не трэба. На мой погляд, трэба альбо супрацоўнічаць, шукаць пункты ўзаемадзеяння, альбо ўлічваць фармат дзейнасці іншых галерэй, улічваць тыя практыкі, якія ўласцівыя ім, і імкнуцца шукаць свае асаблівасці. Раней у Мінску было ўсяго некалькі галерэй, цяпер жа з'явіліся галерэі-салоны, адкрытыя арт-пляцоўкі, крэатыўныя прасторы. І яны заўсёды будуць канкурыраваць, нягледзячы на тое, што супрацоўнікі і кіраўнікі могуць быць у сяброўскіх адносінах. Мне здаецца, што толькі ў канкурэнтаздольным асяроддзі нараджаецца нешта цікавае. А гамагеннасць для культуры — страшная з'ява, якой трэба пазбягаць. Хоць для Беларусі гэта з'ява, на жаль, уласціва, асабліва для рэгіёнаў, дзе бывае адзін музей, бібліятэка або галерэя. Калі ў любы беларускі горад, аграгарадок укараніць яшчэ некалькі культурных аб'ектаў, іх эфектыўнасць і разнастайнасць адназначна вырасце, прычым у разы. Таму я вельмі рады, што ў Мінску ўсё ж такі з'яўляецца жывая канкурэнцыя, прычым не толькі паміж арт-пляцоўкамі, але і самімі мастакамі. Галоўнае, каб яна была здаровая, а гэта, дарэчы, не заўсёды так.

Я хаджу на адкрыццё выставак у розныя галерэі і музеі Мінска. З аднаго боку, атрымліваю эстэтычнае задавальненне, з другога — наладжваю даследчую працу, што дапамагае структураваць і сістэматызаваць сваю дзейнасць. Гэта значыць, я бачу, хто і чым займаецца, улічваю магчымасці і нюансы іншых арганізацый і ў выніку знаходжу арыгінальныя шляхі для рэалізацыі праектаў у нашай галерэі. Галоўнае — не паўтарацца. Не трэба саромецца рабіць нестандартныя мерапрыемствы. Напрыклад, мы 22 чэрвеня праводзілі цырымонію ўзнагароджання рэспубліканскага конкурсу «Лепшы горад для бізнесу ў Беларусі». У межах мерапрыемства арганізавалі невялікую выстаўку твораў былых вязняў нацызму. Многія мэры гарадоў, кіраўнікі адміністрацый, якія прысутнічалі на мерапрыемстве, падыходзілі і дзякавалі нашу каманду за магчымасць не проста атрымаць грамату і пайсці дадому, а паглядзець цікавыя мастацкія творы, адчуць унутры духоўнасць. Некаторыя з удзельнікаў таго мерапрыемства прапанавалі нам супрацоўніцтва.

— Што найбольш эфектыўна ўплывае на піяр галерэі: адкрыццё новых імёнаў альбо, наадварот, праекты, звязаныя з імёнамі знакамітых мастакоў, ці, можа, іншыя стратэгіі?

— Я за разнастайнасць і шматпрофільнасць. З пазіцыі менеджара і кіраўніка лічу, што ў цяперашніх умовах для нашай галерэі выгадна арганізоўваць працу па розных кірунках і весці некалькі ліній. Асноўная мэта, дзеля якой стваралася наша галерэя, — падтрымка творчых ініцыятыў адоранай і таленавітай моладзі (навучэнцаў, студэнтаў), правядзенне выставак у фармаце «настаўнік і вучань». Аднак калі мы абмяжуемся толькі асноўнай функцыяй, да нас ніхто не прыйдзе. Пэўны досвед ужо ёсць. Калі сёння ў нас адкрыццё выстаўкі таленавітага, але нікому не вядомага дзіцяці, заўтра — заслужанага дзеяча мастацтваў, імя якога — брэнд беларускай культуры, а паслязаўтра мы арганізоўваем літаратурны вечар, тады і зараджаецца цікавасць. Па-першае, цікавасць для нас саміх, па-другое, цікавасць для аўдыторыі: разнастайнасць захоплівае. Ну, і трэцяе (напэўна, адзін з галоўных інтарэсаў да арт-пляцоўкі) — увага сродкаў масавай інфармацыі. Ёсць закон: калі няма на мерапрыемстве СМІ, пра падзею ніхто не даведаецца і на выстаўку не прыйдзе, адпаведна, арганізацыя яе была бессэнсоўнай.

Вядома, у мяне як у дырэктара — свае прыярытэты, таму ў «рэпертуары» нашай галерэі будзе не толькі мноства мастацкіх праектаў, але і літаратурныя вечарыны, кніжныя выстаўкі, творчыя сустрэчы. Тым больш кірункі можна сумяшчаць, праводзіць нават у адзін час. Галоўнае — прыцягнуць і зачапіць гледача, паказаць яму, што менавіта ў нашай галерэі ён можа сутыкнуцца з тым, што яму блізка. Трэба вучыцца выходзіць за межы традыцыйнага і вучыцца бачыць мастацтва больш шырока.

— Ці сутыкаліся вы як малады кіраўнік з крытыкай і як змаглі за два гады даказаць, што ваша прафесійная пазіцыя правільная?

— У сферы культуры мяне не вельмі ведалі, а кожная галіна гэтай сферы досыць цяжка прымае новых людзей. Нельга сказаць, што я быў не гатовы, але на практыцы давялося складаней, чым у тэорыі. Было шмат нюансаў з мастакамі, затое лёгка ўсталёўваліся кантакты з пасольствамі, грамадскімі аб'яднаннямі. З часам я зразумеў: каб выконваць свае абавязкі якасна і зарэкамендаваць сябе, трэба вучыцца мець зносіны з арт-грамадскасцю, у якую ўваходзяць не толькі мастакі, але і куратары, мастацтвазнаўцы, калекцыянеры ды і наогул усе аматары мастацтва.

Было няпроста, але самы лепшы спосаб — не звяртаць увагу на негатыў. Калі б мы кіраваліся толькі інструкцыямі, якія датычныя працы галерэі, палова добрых праектаў не адбылася б. Я ведаю адно: згодна з правіламі жыць можна, але трэба рабіць у тры разы больш, каб дзейнасць прыносіла плён. Трэба раіцца з калектывам, які кожны дзень сутыкаецца з гэтай працай і ведае, як правільна рэалізоўваць працэс. За час працы я ўсвядоміў: нельга баяцца быць смелым і ініцыятыўным. Гэта дапамагае знаходзіць магчымасці, часам нават тыя, у рамкі якіх, здаецца, выставачная дзейнасць не падпадае. Зараз мы ўдзельнічаем у розных акцыях: у нейкіх выпадках мы партнёры, а дзесьці — арганізатары. Галоўнае — што мы ёсць у кантэксце гэтых праектаў, што фарміруе пазнавальнасць галерэі. Да прыкладу, мерапрыемства, якое прысвечана 500-годдзю беларускага кнігадрукавання і памяці Францыска Скарыны, якое рэалізуецца фондам Міхала Клеафаса Агінскага: тут мы не засталіся ўбаку, з'яўляемся партнёрамі і адказваем за пэўны блок працы: у Кракаве, Празе, Падуі, Фларэнцыі і Бялградзе пройдуць канцэрты і выстаўкі. Мы не пабаяліся паўдзельнічаць у тэндары і падалі заяўку з прапановамі для арганізацыі Дзён еўрапейскай спадчыны. Міністэрства культуры іх падтрымала, і пад эгідай Савета Еўропы мы сёння праводзім гэты праект.

Праца ў галерэі будуецца, як і сістэма адукацыі: ёсць навуковы і тэарэтычны падыходы, якія неабходныя, але калі б у рэчышчы адукацыйнага працэсу не было гастроляў, пленэраў, сустрэч і стажыровак, не было б і выніку.

— Ці магчыма зарабляць грошы на галерэйнай справе?

— Наша галерэя па заканадаўстве не можа зарабляць грошы для сябе, але дапамагае ў гэтым людзям, якія арганізоўваюць на нашай пляцоўцы праекты. Ёсць шмат прыкладаў. Першы — выстаўка гжэлі, якая адбылася ў 2016 годзе. Наведвальнікі зацікавіліся і набылі шмат твораў у аўтараў. Нашы гледачы актыўна набываюць творы дзяцей — навучэнцаў беларускай школы мастацтваў. Ёсць і іншыя прыклады дапамогі талентам: у нашай галерэі намеснік міністра інфармацыі Алесь Карлюкевіч убачыў творы маладой мастачкі Дзіяны Каласовіч і прапанаваў ёй зрабіць жывапісныя творы помнікаў культуры для кнігі, якую рыхтуе адно з беларускіх выдавецтваў. Былі выпадкі, калі прадстаўнікі іншых музеяў і галерэй тэлефанавалі нам і прасілі кантакты, каб выставіць працы творцаў, якія экспанаваліся на нашай пляцоўцы.

— У Дзіяны Каласовіч была першая выстаўка, пасля пра яе загаварылі ўсе навокал. Гэта выпадковасць ці сапраўды галерэя дапамагла маладой мастачцы сфарміраваць імідж? Ці былі яшчэ такія выпадкі?

— Дакладна не выпадковасць. Раней Дзіяна ўдзельнічала ў калектыўных выстаўках, дзе сярод вялікай колькасці работ, напэўна, было складана вылучыцца. Персанальная выстаўка, калі цэнтральная — асоба аўтара, — гэта свята, у выпадку з Дзіянай усё сышлося: яе талент і ўнутраная цеплыня неверагодна ўразілі гледачоў. Асабліва, калі ўлічыць той факт, што гэта быў час адпачынкаў. Але творы глядзелі і маглі стаяць каля іх гадзінамі — настолькі моцная энергетыка ў аўтара. Галерэя дапамагла Дзіяне зрабіць крок наперад.

Падобныя выпадкі былі. Напрыклад, выстаўка пясочнай графікі: майстры былі ўражаны, наколькі беларусы зацікавіліся гэтым відам мастацтва. Яны казалі, што аб'ездзілі паўсвету са сваімі творамі, але такой цікавасці да сабе не адчувалі ні разу. У гэтым выпадку мы зрабілі правільны піяр. Мы не пазіцыянавалі пясочную графіку як забаву, а паказалі яе як мастацтва, шматграннае і новае для нашай тэрыторыі.

Бывала і так, што праз праекты адкрывалася асоба куратара, а не мастака. Гледачы заўважалі, наколькі правільна выбраны падыход і канцэпцыя праекта, глядзелі на экспазіцыю, і куратар для іх станавіўся галоўным героем вечара, як, напрыклад, адбылося з мастацтвазнаўцай Аксінняй Сяліцкай.

— Ці развітая ў Беларусі галерэйная справа, як на вашу думку?

— Мне здаецца, што ў поўнай меры яшчэ не развітая, ёсць куды рухацца. У нас заўсёды будуць добра працаваць галерэі і музеі са статусам нацыянальных альбо тыя, што знаходзяцца пад уладай універсітэтаў. Цяпер у Мінску многа галерэй-салонаў, але, як правіла, яны збіраюць сваё кола, і пра іх мала хто ведае. Справа ў тым, што галерэя ў класічным варыянце працы павінна зарабляць грошы, а ў нашых умовах гэта рабіць складана. Дастаткова ўспомніць «Дом карцін», некаторы час адну з папулярных выставачных пляцовак у Мінску, а сёння галерэя зачынена: фінансавы бок адыграў тут немалаважную ролю.

Але галерэй нашага тыпу гэта не тычыцца: мы павінны выконваць асветніцкую задачу, і таму аўдыторыя ў нас больш шырокая (не толькі дарослае пакаленне, але і дзеці).

Калі ў краіне, асабліва ў сталіцы, адкрываецца новая галерэя, трэба канкрэтна разумець, для чаго яна, ці мае яе існаванне сэнс. У нас многа таленавітых людзей, культура рухаецца далей, таму і галерэйная справа будзе так ці інакш развівацца.

Вікторыя АСКЕРА, фота аўтара

Калі мы разам

Нататкі пра фестываль «Белая Вежа»-2017

У свеце, дзе не спыняюцца палітычныя, нацыянальныя і ваенныя канфлікты, мастацтва існуе як прымірыцельная сіла. На міжнародных фестывалях людзі тэатра заўсёды маюць дружалюбныя зносіны, а спрачаюцца выключна па творчых пытаннях. Зараз ніхто не жыве спакойна, але любое свята мастацтва — гэта лакуна, дзе ўзнікае яднанне, радасць і разуменне, завязваюцца цікавыя знаёмствы.

Міжнародны тэатральны фестываль «Белая Вежа» не стаў выключэннем. Сустракаліся даўнія сябры з розных краін. Абменьваліся візітоўкамі і адрасамі новыя знаёмыя. Шчырыя пачуцці аб'ядноўвалі ўсіх, калі спадабаўся спектакль. Калі нешта не падабалася і моцна засмучала, імкнуліся казаць пра гэта мякка і далікатна.

СВАБОДНАЕ ПЛАВАННЕ

Можна настальгічна сумаваць па пачатковым фестывальным размаху «Белай Вежы» дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя. За мінулыя дзесяцігоддзі свята станавілася ўсё больш сціплае, аднак нязменна нарошчвала геаграфію запрошаных і ўскладняла сваё ўтрыманне за кошт панарамы найноўшых мастацкіх тэндэнцый. За дваццаць два гады ў Брэсце пабывалі тэатры больш як з шасцідзесяці краін свету, у тым ліку абсалютна невядомыя беларускай публіцы. Калісьці каля двух тыдняў побач з будынкам Брэсцкага тэатра стаяла мангольская юрта з акцёрамі з Манголіі. Прыязджалі японскія лялечнікі і «гарачыя» выканаўцы з Венесуэлы. На цэлы тыдзень затрымліваўся акцёрскі дэсант з Паўднёвай Асеціі з жонкамі і дзецьмі. Згаладалых акцёраў, якія атрымалі перадышку ад нацыянальнага канфлікту ў сваёй краіне, падкормлівалі і аблашчвалі ўсім светам. Але, вядома ж, сталымі ўдзельнікамі свята тэатра былі калектывы з Беларусі, Расіі, Польшчы, Літвы, Украіны. Сёлетні фестываль быў параўнальна больш сціплым, без пафасных прамоў і візітаў высокіх гасцей, але як заўсёды насычаны (27 спектакляў з 14 краін) і вельмі дзелавы.

Згодна з традыцыяй, якая склалася на фестывалі, тут няма журы. Ёсць каманда экспертаў-крытыкаў, якія штодня сустракаюцца з пастановачнымі групамі і рэжысёрамі і вядуць гутарку пра выбар драматургічнага матэрыялу, трактоўку п'ес, выразнасць сцэнаграфіі, пра нюансы працы акцёраў. Такія зносіны фарміруюць разуменне, у які бок тэатрам ісці далей.

Дырэктара фестывалю Аляксандра Козака пастаянна просяць сфармуляваць канцэпцыю мерапрыемства. Дасведчаны кіраўнік, акцёр і рэжысёр, Козак жартаўліва адмаўляецца, не прызнаецца, што абапіраецца выключна на ўласныя густы і прыхільнасці. Ён увесь час у курсе тэатральнага працэсу, шмат ездзіць, глядзіць, чытае. Можна сказаць, што задуманая і ажыццёўленая ім «Белая Вежа» — гэта свабоднае плаванне, без тэндэнцый і юбілейных прысвячэнняў, што дапускае незапланаваныя выпадковасці.

На фестывалі 2017 года ярка выявілася адна асаблівасць сённяшняга тэатральнага жыцця — незадаволенасць афішай дзяржаўных рэпертуарных тэатраў і жаданне драматургаў, рэжысёраў, акцёраў самастойна ажыццяўляць задуманае, шукаць новую мову зносін з публікай. Акрамя дваццаці васьмі афіцыйных дзяржаўных тэатраў, у Беларусі існуюць семдзесят розных прыватных тэатральных праектаў. Некаторыя з іх бяруць пад сваё крыло стацыянарныя тэатральныя калектывы, другія — распадаюцца, трэція — становяцца самастойнымі. Падобны працэс характэрны і для іншых краін. На сённяшняй «Белай Вежы» прыватныя праекты (тэатры без памяшканняў і стабільнага фінансавання) дэманстравалі Расія, Эстонія, Літва, Фінляндыя.

РАСІЯ

На думку крытыкаў, спектаклі з Масквы, Санкт-Пецярбурга і Татарстана (усяго пяць) не асвятлілі расійскую тэатральную панараму. Іх адбор быў выпадковым. З гэтым нельга пагадзіцца цалкам, таму што Маскву прадстаўляла «Скрыпка Ротшыльда» ў рэжысуры Камы Гінкаса паводле апавядання Антона Чэхава з адзіным за трыццаць гадоў яе жыцця ўдзелам зорнага складу выканаўцаў, сярод якіх — добра вядомыя народныя артысты Валерый Барынаў і Ігар Ясуловіч. Сцэнаграфія — не менш вядомага мастака Сяргея Бархіна. «Скрыпка» мае вышэйшую ўзнагароду Расіі — «Залатую маску». Яна аб'ехала ўвесь свет, уключаючы Амерыку. Да яе навечна далучыліся захапленні: «майстэрскі, абяззброенна цвярозы спектакль», «рэжысёр праводзіць герояў і гледачоў праз выпрабаванне жыццём без абязбольвальных тэатральных сродкаў», «спектакль — сапраўднае адкрыццё, ён захапляльна прыгожы і паэтычны, аднолькава захапляе і сэрца, і інтэлект», «пульсуючыя хвалі гарачага і халоднага, камедыі і трагедыі», «пранізліва і прадбачліва».

Гэтым сказана ўсё. На «Белай Вежы» 2017 года ён быў названы лепшым спектаклем фестывалю.

Горшым (далёка не ўсе, але многія) палічылі трагікамічны праект з Санкт-Пецярбурга «Білі Мілігран». Гэта чатырохгадзіннае дзейства ў стылі псіхадэлічнага тэатра Пятра Мамонава (цяпер, на жаль, забытага), пабудаванае на правядзенні медыцынскіх экспертыз у чаканні судовага прысуду. Дзея адбываецца ў псіхіятрычнай клініцы, дэманструе злом свядомасці. Праект сыграны маладым энергічным калектывам як студэнцкія эцюды, якія не перараслі ў цэласны спектакль.

З Масквы прыехаў камерны спектакль «Дачка», сціплая студэнцкая праца садружнасці маладых акцёраў тэатра «Студыя». Гэтая сацыяльная драма, расказаная празаічным тэкстам Захара Прылепіна, выклікала бурную дыскусію гледачоў. Вядомы ў Мінску рэжысёр Іскандэр Сакаеў паставіў у татарскім горадзе Альмецьеўску брэхтаўскае «Мяшчанскае вяселле», што было сыграна азартна і тэмпераментна. Пяты расійскі спектакль «УДВ. Усім добры вечар» быў гасцявым, антрэпрызным. Яго рэжысёр і выканаўца галоўнай ролі вядомы па тэлеэкране: Аляксандр Балуеў.

Сцэна са спектакля «Скрынка Ротшыльда».

ПОЛЬШЧА

Наша найбліжэйшая суседка заўсёды прадстаўлена ў Брэсце і ахвотна прымае ў сябе беларускія тэатры. Двухбаковым кантактам актыўна спрыяе Польскі інстытут у Мінску і Генеральнае консульства Рэспублікі Польшча ў Брэсце. Гэтым разам на сцэне былі два тэатры з Гданьска і Вроцлава, дзве п'есы вядомых польскіх драматургаў Вітольда Гамбровіча, Славаміра Мрожака, сыграныя тэатрамі з Венгрыі і Грузіі, і музычны спектакль у жанры перфарматыўнага кіно, які выкарыстоўвае ўнікальныя тэатральныя тэхналогіі.

Гэтага было дастаткова, каб акунуцца ў польскую тэатральную культуру мінулага стагоддзя (Гамбровіч і Мрожак), сённяшняга дня (мультымедыйны перформанс) і нават зведаць захапляльную гісторыю племені кашубаў, якое пражывае ля ўзбярэжжа Балтыйскага мора. Польскі тэатр, як і заўсёды, быў на вышыні. Таго ж самага на фестывалі чакалі ад Літвы.

ЛІТВА

Чаканні апраўдаліся, хаця сёлета не было ўлюбёнца брэсцкіх гледачоў Альгірдаса Латэнаса і яго спектакляў. Затое пазнаёміліся з маладой тэатральнай студыяй Сільвы Крывіцкенэ, ужо вядомай у Беларусі па фестывалі «Март-кантакт». Гэтае творчае аб'яднанне выхоўвае выканальніцкую культуру на тэкстах Дастаеўскага і Чэхава. Яны сыгралі чэхаўскую п'есу «Іванаў» у мінімалісцкім аздабленні, практычна без дэкарацый, у касцюмах, набліжаных да сучаснай моды, што дазваляе старанна працаваць з сэнсавым матэрыялам драмы і захоўваць ансамбль. Спектакль заслужыў галоўную ўзнагароду за рэжысуру, хаця частка брэсцкіх гледачоў не захацела ўнікаць у тонкасці і палічыла пастаноўку сумнай.

Меркаванні пра другі літоўскі спектакль «Анёлы Дастаеўскага» былі аднадушнымі. Верная жанру монаспектакля Бірутэ Мар нязменна на ўсіх фестывалях скарае майстэрствам і тонкасцю выканання. Выступаючы тут не толькі як выканаўца, але і як рэжысёр, яна акунае гледачоў у свет праўды і мудрасці, сумлення і свабоды выбару, кахання і веры. Камедыя, драма, трагедыя — актрысе падуладна ўсё.

УКРАІНА

У адрозненне ад мінулых фестываляў у Брэсце краіна выглядала сціпла. Украіну прадстаўляў музычна-драматычны тэатр з горада Роўна спектаклем паводле п'есы Надзеі Птушкінай «Ненармальная». Абсалютна глядацкі спектакль, які заваёўвае нават інтэлектуалаў і скептыкаў, апавядае пра каханне. Рэжысёр Уладзімір Петрыў і двое выканаўцаў вельмі прафесійна і далікатна раскрываюць псіхалогію рамантычных адносін.

Улюбёнец Брэста, стваральнік узрушальных вулічных спектакляў Яраслаў Федарышын, на гэты раз расчараваў. Яго «Цягнік з Львова», прадстаўлены ў стылі нямога кіно, быў пазбаўлены чаканай выразнай акцёрскай пластыкі і піратэхнічных эфектаў. Акцёры спявалі вядомыя песні мінулага стагоддзя на некалькіх мовах, шмат бегалі, але ўжо не здзіўлялі ўнікальным майстэрствам. Яны заехалі ў Брэст па дарозе на працяглыя гастролі і, магчыма, бераглі сілы.

ЭСТОНІЯ ДЫ ІНШЫЯ

Эстонскія тэатры даўно не бачылі ў нашай краіне. Думаю, што пра беларускую тэатральную культуру эстонцы таксама не маюць уяўлення. Тым цікавей было знаёмства з маладым тэатрам «Ферць», які іграе на рускай мове (раней ён называўся «Руская тэатральная школа»). Каманда энтузіястаў пад кіраўніцтвам Ірыны Томінгас не мае свайго памяшкання, датацый і спонсараў. Насуперак усяму яны існуюць і ездзяць на фестывалі, часцей за ўсё ў Расію.

П'еса эстонскага драматурга Урмаса Ленука «Боб ведае» прайшла ва ўсіх тэатрах Эстоніі, але тэатр «Ферць» прачытаў яе не толькі як гісторыю цяжкай любові, але і разглядзеў у ёй мноства сэнсаў, пачынаючы з вечных законаў, згодна з якімі ўладкаваны свет. Глыбокая вынаходлівая рэжысура адмаўляецца ад відовішчнасці. На сцэне — усяго два крэслы, якія выконваюць розныя функцыі і пастаянна працуюць разам з акцёрамі. Аднак перад намі — сапраўдны тэатр у адсутнасці традыцыйнага разумення тэатра. У ім цудоўныя акцёрскія работы.

ЭТНІЧНАЕ І ІНШЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

Зусім расчаравалі калегі з **Латвіі**, хаця іграліспектакль паводле апавяданняў Аркадзя Аверчанкі, класіка рускай літаратуры, звязанага з Рускім тэатрам у Рызе. Крыўляліся і перацісталі ў падачы тэксту.

Грузія заваявала публіку тэмпераментам і прыгожымі грузінскімі песнямі, дадаўшы трохі палітычнага акцэнту.

Венгры выкарыстоўвалі ў сцэнаграфіі гіганцкія рулоны туалетнай паперы і пазалочаныя ўнітазы.

Казахі дзівілі нацыянальнымі рытуаламі, выявамі духаў продкаў, прыгожым этна.

Чэхі ў сваім вулічным спектаклі ездзілі на гіганцкіх роварах, на якія можна падняцца толькі па спецыяльнай лесвіцы.

Сумнаваты спектакль «Споведзь» атрымаўся ў **македонцаў**. Яны расчыталі свет скандынаўскага генія Інгмара Бергмана як статычнае дзейства і адсутнасць думак пра пошук духоўнай свабоды. Магчыма, македонцы хацелі прытушыць свой паўднёвы тэмперамент і асвоіць стылістыку марудлівай паўночнай Швецыі. Не атрымалася: спадчына вядомага шведа засталася для іх загадкай.

Таксама зусім не зразумелі раман Дастаеўскага «Злачынства і пакаранне» рэжысёр і актрыса з Фінляндыі. Далікатную неабароненую Сонечку Мармеладаву яны выпусцілі ў сучасны свет і зрабілі дасведчанай прастытуткай. Кароткая, схематычна скажоная прабежка па вялікім рамане будавалася на песенным вінегрэце. Спявалі «Полюшко-поле», французскі шансон, рок і іншыя «Сумныя песні з сэрца Еўропы» (так называўся іх спектакль). Частавалі гледачоў віном, а п'янчужка Мармеладаў — бацька Сонечкі — хадзіў па барах з чырвоным сцягам, на якім былі намаляваны серп і молат. Усё змяшалася ў фінскіх галовах, але нашы людзі вырашылі, што гэта адбылося таму, што ў фінаў сухі закон, і яны ад душы напоўнілі свой спектакль бутэлькамі з алкаголем.

У апошні дзень фестывалю паказалі «Беспасажніцу» з **Малдовы**. Тэкст п'есы Аляксандра Астроўскага змясцілі ў сучасную рэальнасць, напоўніўшы бандыцкімі разборкамі, бойкамі, сексуальнымі сцэнамі.

Сабраўшы ў кучу поспехі і няўдачы асобных спектакляў, мы не паспелі сказаць пра галоўнае: вельмі разнастайна і годна была прадстаўлена тэатральная Беларусь. Яна пачынала свята, закрывала яго і перамагла ў чатырох намінацыях, паказаўшы сем спектакляў у розных формах і жанрах. Але пра гэта — у наступны раз.

Таццяна АРЛОВА

АФІША НА КАСТРЫЧНІК:

ідэальны дзень, іранскі рэйв і скандальная жанчына

Калі хочацца адчуць цяпло халоднай восенню, то лепш за ўсё зрабіць гэта ў кінатэатры. Тым больш што некаторыя прэм'еры будуць сапраўды гарачымі.

1. Самы вялікі Міжнародны форум кароткаметражнага кіно — Манхэтанскі кінафестываль — зноў аб'яднае 6 кантынентаў, 250 гарадоў свету і беларускіх гледачоў. Юбілейны, 20-ы, сезон адкрыецца 29 верасня, а паказы працягнуцца да 8 кастрычніка. Сёлетні кінафорум зноў стане нагодай для гледачоў адчуць сябе не проста кінааматарам, а прафесійным кінакрытыкам, бо менавіта аўдыторыя выбірае лепшую стужку і акцёра. Усе 10 фільмаў пакажуць на мовах арыгінала з субтытрамі, а паглядзець і сапраўды будзе на што! Напрыклад, у праграме — новазеландскае кіно пра тое, як урачам часам даводзіцца ісці супраць клятвы Гіпакрата; амерыканская стужка пра тое, што нават уяўнае багацце ўплывае на чалавека; брытанскі фільм пра іншую Другую сусветную вайну; італьянская кінастужка пра моцную жанчыну; грузінскае кіно пра чарадзеяў і яшчэ шмат чаго цікавага. Манхэтанскі кінафестываль — выдатная нагода не толькі адчуць сябе ўдзельнікам кінапрацэсу, але і зразумець, што ж асаблівага хаваецца ў сусветным кінематографе.

2. Новы сезон рэгіянальнай версіі міжнароднага фестывалю дакументальнага кіно пра сучасную музыку і культуру *Beat Weekend* пройдзе ў мінскім кінатэатры «Ракета» з 4 па 8 кастрычніка. Задача праекта — даць магчымасць маладым людзям убачыць новую дакументалістыку пра культурныя феномены і герояў, якія ім цікавыя і блізкія. У сёлетнюю праграму ўвайшло шмат цікавых фільмаў: сенсацыя кінафестывалю *Sundance* «Усе гэтыя бяссонныя ночы» — пра таямнічае пакаленне 20-гадовых у дэкарацыях начнога жыцця Варшавы; адзін з самых гучных фільмаў года «Дзень незалежнасці» — хроніка падарожжа славенскага рок-гурта ў Паўночную Карэю; «Рэйв ў Іране» — хіт мінулагодняга фестывалю «Лістапад» пра сакрэтныя вечарынкі ў Тэгеране; кіно «Хайп!» — дасціпны і культавы даведнік па музычнай сцэне Сіэтла 1990-х. Асаблівы падарунак — новая работа нямецкага рэжысёра Рамуальда Кармакара і аператара Тома Тыквера «Калі я думаю пра Германію ноччу» — распавядзе, як электронная сцэна ператварылася ў паўнапраўную мастацкую інстытуцыю. Калі хочацца чагосьці яшчэ больш блізкага, то можна паглядзець расійскі фільм «Я — Гагарын».

3. У кастрычніку ў Беларусі ўсё ж пакажуць скандальную кінастужку «Матыльда» Аляксея Учыцеля: улічваючы, што тут ёсць мастацкая выдумка, а сама стужка вельмі прыгожая, дыхтоўная і якасна выкананая. Гістарычная меладрама распавядае пра адносіны балерыны імператарскага тэатра Матыльды Кшэсінскай і цэсарэвіча Мікалая Аляксандравіча. Героі сапраўды знакавыя, а гісторыя, якая стала асновай сюжэта, магла б змяніць рускую гісторыю, а не проста стаць легендай пра каханне. Праца над фільмам пачалася 7 гадоў таму, да яе былі прыцягнутыя звыш 10 сцэнарыстаў (у тым ліку амерыканскіх і французскіх), у выніку аўтарам стаў пісьменнік Аляксандр Церахаў. Большая частка 25-мільённага бюджэту была выдаткаваная на дэкарацыі і 5 тысяч касцюмаў, а здымкі праходзілі ў знакавых для расійскай гісторыі месцах: Вялікім Екацярынінскім і Аляксандраўскім палацах у Царскім Сяле, у Марыінскім тэатры ў Санкт-Пецярбургу. На экране можна будзе ўбачыць вядомых артыстаў (Міронаў, Казлоўскі, Дапкунайтэ), а ролю Матыльды выканала маладая польская актрыса Міхаліна Альшанская.

УСЁ АДНОСНА:

5-хвілінны фільм як адраджэнне індустрыі

У беларускай кінематаграфічнай прасторы кожны месяц адметны. Асабліва восенню. Калі чакаць «Лістапада» не хочацца, а наталіцца добрым кіно — наадварот, то ў кастрычніку ў Мінску можна наведаць фестываль кароткаметражнага кіно *Open Air Short Film Festival*. Арганізатар падзеі Васіль Цыбулька распавёў пра маладое пакаленне беларускіх рэжысёраў, фестывальнае жыццё і амбіцыйныя праекты.

— У Беларусі, здавалася б, фестываляў кіно хапае, таму навошта спатрэбіўся яшчэ адзін фестываль кароткаметражнага кіно? Ці гэта нешта наватарскае і карыснае для нашага кінапрацэсу?

— Усё залежыць ад таго, што лічыць за «многа» і адносна чаго вымяраць. Неаднойчы даводзілася бачыць інтэрнэт-платформы, праз якія дасылаюць заяўкі на розныя замежныя кінафестывалі. У спісах конкурсаў такіх краін, як Францыя, Англія, Іспанія, Італія, не кажучы ўжо пра ЗША, — па некалькі соцень пунктаў. Нашыя блізкія суседзі — таксама наперадзе па колькасці такіх падзей. У нас іх, мабыць, каля дзясятка. Што тычыцца стану нашай кінаіндустрыі, то фестываляў павінна быць больш, бо гэта дазваляе нашым рэжысёрам знаёміцца з досведам калег з усяго свету. Тут адно правіла: чым больш — тым лепш. Колькасць па ўсіх законах рана ці позна пераходзіць у якасць. І мы таксама намагаемся зрабіць унёсак у гэты працэс. Да таго ж міжнародныя імпрэзы папулярызуюць Беларусь як пляцоўку, адкрытую для творчасці.

— Як фарміруецца праграма: хто і па якіх крытэрыях адбірае фільмы?

— Журы складаецца з беларускіх рэжысёраў і кінакрытыкаў. Усе дасланыя фільмы на першай стадыі адбору правяраюцца на эксклюзіўнасць, хронаметраж і этыку. Гэта значыць, работы не могуць быць у свабодным доступе ў сеціве, не павінны перавышаць 5 хвілін, не могуць змяшчаць неэтычныя матэрыялы. На другім этапе складаецца пашыраны шорт-ліст з тых стужак, што прайшлі першы этап: звяртаецца ўвага на мастацкасць, ідэйны змест, лаканічнасць, карацей, на тое, што павінна адпавядаць паняццю «мастацкі твор». На апошнім этапе фарміруецца канчатковы шорт-ліст. Асноўны прынцып — разнастайнасць. У першым спісе можа быць шмат добрых фільмаў з адной краіны, стужак аднаго жанру, фармату, ідэі. Калі высвятляецца, што карціна ўжо была паказана на якім-небудзь беларускім фестывалі, можам паставіць на яе месца тое, што будзе ў навіну для нашых гледачоў і рэжысёраў. Для таго каб даць магчымасць убачыць поўную і аб'ёмную карціну сусветных тэндэнцый у кароткаметражным кіно, даводзіцца ахвяраваць добрымі стужкамі.

— Ці з'яўляецца хронаметраж у 5 хвілін звышкароткім? Чым такі фармат настолькі цікавы, што яму прысвечаны асобны фестываль?

— На захадзе звышкароткімі, як правіла, называюць фільмы, меншыя за хвіліну, але ўсё адносна. У параўнанні з 30-хвіліннымі кароткаметражкамі пяцігвілінныя выглядаюць неверагодна кароткімі, вядома. Мы абралі гэтую нішу таму, што ніхто да нас у Беларусі не канцэнтраваўся на такіх «звышкароткіх» работах. Мяркую, што гэтага часу дастаткова, каб выкласці сваю думку і ўсталяваць эмацыянальны кантакт з аўдыторыяй. І, нарэшце, такі «таймінг» дазваляе за гадзіну-паўтары паказаць нашмат больш насычаную праграму.

— Наколькі рэальна зрабіць якаснае, паўнавартаснае кіно з такім хронаметражом?

— Любы твор кіно павінен мець завязку, кульмінацыю і развязку ў тым ці іншым выглядзе. Гэта тры кіты, без якіх далёка не адплывеш. У поўнаметражных фільмах усе тры стадыі насычаюцца і разбухаюць як губка дзеля стварэння відовішчнасці. За пяць хвілін можна зрабіць усё тое ж самае. Гэта будзе складаней, бо патрабуецца стварыць канцэнтрат, эсэнцыю. І калі атрымалася зрабіць добра і якасна, на такой аснове можна лёгка зрабіць «вялікае» кіно. Таму якаснае і паўнавартаснае кіно працягам у 5 хвілін — не менш рэальнае, чым звычайны поўны метр.

— Летась у шорт-лісце не было ніводнай работы з Беларусі. Чаму так атрымалася?

— Тады на конкурс прыйшло больш як 4 тысячы заявак. Усяго толькі некалькі з іх былі беларускімі. Але яны, на жаль, не пасавалі пад фармат — не адпавядалі хронаметражу. Думаю, справа яшчэ і ў тым, што фестываль быў амаль невядомы ў беларускіх кінаколах. Мы напачатку ўвогуле планавалі вылучыць нацыянальны і міжнародны конкурс, але, на жаль, атрымалася так, як атрымалася.

— Вы адзначалі, што сёлета пакуль на конкурс пададзена адна работа ад нашай краіны. Чаму нашы кінематаграфісты неактыўныя ў межах уласнай краіны?

— Сапраўды, прыйшла адна работа ад беларускага аўтара. І трапіла ў шорт-ліст. Не таму што «абы якая, але свая», а таму, што адпавядае ўсім патрабаванням, і гэта радасна. Чаму зноў так мала, не магу сказаць дакладна. Магчыма, мала рэкламы, піяру, а можа, і на самай справе нашыя творцы арыентуюць сваю дзейнасць на замежжа, грэбуючы лакальнымі кінафестывалямі.

— Ці можа фестываль стаць своеасаблівай пляцоўкай для аб'яднання беларускіх рэжысёраў, суполкай маладых кінематаграфістаў?

— Ёсць выраз, што «дарога ў тысячу кіламетраў пачынаецца з аднаго кроку», таму я такой магчымасці не адмаўляю. Але мы не пазіцыянуем наш конкурс як пляцоўку для аб'яднання. Наша мэта — паказаць і распавесці пра новае, стварыўшы атмасферу, якая садзейнічала б натхненню і развіццю. А калі наконт суполак, то яны ўжо ёсць. Можа быць, не «раскручаныя» і мала прадстаўленыя ў СМІ, але ёсць.

— Якой бачыцца будучыня кінафестывалю? Зараз гэта не вельмі маштабная падзея, а кінапаказ у Музеі кіно…

— Безумоўна, мы хацелі б бачыць фестываль вялікай падзеяй з рознымі майстар-класамі і масавымі кінапаказамі на вольным паветры цёплымі ліпеньскімі вечарамі. Сама ж назва так і перакладаецца: «Фестываль кароткаметражнага кіно на вольным паветры». Аднак мы не імкнёмся нешта здабыць сілай: час, як правіла, усё расставіць па месцах. Ён, з аднаго боку, праверка, індыкатар трываласці, а з другога — механізм станаўлення, узмужнення. Фестывалю ўсяго толькі два гады, таму пакуль што ён — немаўля, якое пачынае рабіць першыя нясмелыя крокі.

Крысціна ТРАСКО

АПАНТАНЫ РАДЗІМАЙ

Дваццаць гадоў мінула, як узышла на нябёсы душа зямнога вандроўніка Міхася Раманюка, мастака, этнографа, даследчыка, збіральніка, — зорная постаць беларускага Адраджэння.

Душа здзейсніла сваё наканаванне, спраўдзіла задачы не толькі свае, але і шматлікіх іншых, каму не пашанцавала з пераборлівым спадарожнікам-сумленнем, чый зямны кон не прынёс плёну і застаўся пустацветам.

Тое, што іншыя разбуралі, ён абараняў. Тое, што іншыя раскідвалі, ён збіраў. Тое, што іншыя прадавалі, ён зберагаў і захоўваў.

Ён сабраў «беларускі космас» нацыянальнага традыцыйнага строю і тым здзівіў не толькі Парыж і Ліён, але і саміх беларусаў.

Назвы кінутых і забытых вёсак ён перанёс у свае кнігі.

Хойніцкі абшар, патрапіўшы ў зону радыяцыйнага адчужэння, нема галасіў мёртвымі дрэвамі і пустымі вёскамі. Ён выратаваў адзіны і адзінкавы ў свеце скарб — непаўторнае аблічча матэрыяльнай культуры гэтага краю. Аўтэнтычнасць беларускай жанчыны набыла сімвал Беларусі дзякуючы яму.

Сакральнасць беларускіх крыжоў, надмагіллі, пахавальныя абрады беларусаў упершыню былі засведчаны ім перад усім светам — унікальнымі фотаздымкамі і фактамі. Архіўныя матэрыялы, далікатныя і змястоўныя аўтарскія тэксты пазбаўляюць сэнсу спрачацца і сумнявацца ў старажытнасці паходжання народа, да якога ён належыць. Не пакідаюць падстаў сумнявацца ў адметнасці і ні да чаго не падобнай ментальнасці, глыбокай укаранёнасці і сакральнасці культуры беларусаў. Глядзіш на тыя крыжы, строі, ручнікі, твары і міжволі задумваешся: ці не з'яўляецца беларускі народ носьбітам нейкіх неверагодных ведаў, закансерваваных і закадзіраваных да пары ў строга і непахісна ўсталяваных невядома кім абрадах і рытуалах?

Мова. Прыярытэт беларускай культуры. Прыярытэтнай яна была і ў жыцці Міхася Раманюка. Прыярытэтным было і беларускае мастацтва: нацыянальнае як самакаштоўнасць і неад'емная частка мастацтва сусветнага.

***

Пражыць 53 гады. Застацца ў завершаных справах. Застацца ў зморшчынах падзей няпростага часу са сваім народам і дараваць яму сваё запозненае прызнанне. Жыць у краіне Беларусь і цярпець кпіны, папрокі, неразуменне ад дзяржавы. Стварыць і ачоліць для краіны часопіс «Мастацтва» і праз два гады сысці з пасады галоўнага рэдактара па жаданні дзяржавы. З насмешлівым разуменнем ставіцца да адмаўлення дзяржавай у фінансаванні экспедыцый і ладзіць іх за свой кошт дзеля краіны. Быць удзячным, што прыдаўся гэтай зямлі. Прыдаўся, нарадзіўшыся з чуйнай душой, духоўным інтэлектам і пачуццём віны.

Месца нараджэння…

Месца нараджэння азначылі рэчкі з залатым пяском, пругкія вятры з непадробным водарам падарожжаў, цёмныя дажджы над лесам. Дажджы ўзляталі вясной і ападалі ўвосень. Зіма прыходзіла са сваімі дзівосамі: дым над хатамі выпісваў тонкі кужаль таемных знакаў і нагадваў танец рамбаў-крыжыкаў на вышытых бабулямі ручніках. Улетку ветракі адчайна ганялі аблокі, пад млынамі цурчэла вада гучаннем ціхіх песень, раздарожжы містычна спынялі, скрыжаванні ставілі меціну, крыжы зачароўвалі.

Бацькі…

Бацькі — трывушчыя беларусы. Бабуля з песнямі, матуля з калыханкамі. Кавалі ды Старынкі — родныя вёскі. Столькі багацця. Столькі прычын для шчасця. Поле з перапёлкамі. Густая канюшына. Купы сена з конікамі. Столькі лагоды, волі, замілавання, паветра, сонца.

Ворань чорная сядзіць, крыламі махае, з Міхаські перапуг вынімае… Ляцелі сарокі і ўхапілі Міхаськавы ўрокі… Ляцеў птах па гарах, сеў на Аленчыных варатах. Стаў шчабятаці, урокі сабіраці. Пашчабятаў, урокі назбіраў, паляцеў на сіне мора…

Маленства…

Маленства мінулася. Прайшло і дзяцінства. Юнацтва адкрыла сэрца. Жыццё здзівіла нечаканым паведамленнем: у цябе нічога няма. Ні мовы. Ні гісторыі. Ні мінулага. Ні звонкіх святаў, ні святых крыніц, ні аброчных ручнікоў пры іх, ні крыжоў пры дарозе. Гэта перажытак. Учарашні дзень. Эфемернасць. Хворае ўяўленне. Каштоўнасці — у актыўнай пазіцыі ў барацьбе за...

Агромністая маса людзей існавала захінутая ад сябе самой шэрай тлумнасцю дзён. Суцэльная біялогія. Аднаразовае выкарыстанне. Пафасны фасад — «савецкія людзі». Нізкачастотныя вібрацыі неабуджанай свядомасці, дзе не прадугледжана заклапочанасць ідэнтыфікацыяй. Катэгорыі «нацыя», «нацыянальная культура» — строга дазіраваныя.

Міхась Раманюк.

Цемра. Час, калі прыходзяць выратавальнікі. Час, калі запускаецца праграма — кодавая, родавая, касмічная. Містычныя раздарожжы пакрываюцца туманамі, спыняюць Вандроўніка.

***

«Няхай блаславёнымі будуць тулянні-падарожжы дзеля вызвалення радзімы».

Шарль дэ Кастэр

Робін Гуд, Машэка, Ян Гус, Люцыян Таполя — гумар і пакуты, жарты і пагрозы, каханне і нянавісць, жыццё на выгнанні, таемнае вяртанне на радзіму… Жыццё героя.

На кожнай зямлі абавязкова народзіцца той, хто зразумее неабходнасць сабраць раскіданыя па дарогах гісторыі скарбы. Пасля вярнуцца дадому, сесці за пісьмовы стол і напісаць дасланне чалавецтву.

Сціплы вучоны і літаратар, светлавалосы высокі фламандзец Шарль дэ Кастэр сабраў легенды пра народнага героя Фландрыі Ціля Уленшпігеля, злучыў асобныя часткі і стварыў бессмяротную кнігу. У легендзе пра Ціля, па драбніцах занатаваных у манускрыптах і сярэднявечных дакументах, раздзёртых на часткі, як некалі сама Фландрыя, паўстаў нацыянальны герой. Хітрун і шэльма, блаславёны на тулянні па роднай зямлі, стаў збіральнікам народнага духу і супраціву. Ціль праходзіў па краіне, і людзі падымаліся за ім. Падымаліся супраць тых, чыім дэвізам — «лізаць, пакуль не прыйшоў час укусіць».

Кніга Кастэра не мела поспеху ў сучаснікаў. Палохаў змест, гнеў, нянавісць да ўлады. Кастэр распавядаў пра мінулае, а голас трымцеў абуранасцю супраць несправядлівасці свайго часу.

Прызнанне прыйшло пасля смерці. Бессмяротнасць Ціля як бессмяротнасць народа. Народ можа заснуць, але ніколі не можа ўмерці.

Досвед Лінэя даводзіць: калі вольны рост расліны абцяжарыць, напрыклад, недахопам прасторы альбо неяк інакш, расліна будзе імкнуцца пакрыць недахоп росту большай колькасцю насення і народзіць удвая больш. Слава тыранам! Яны вымушаюць народ быць пільным, вынаходлівым і набываць тое, што нельга адабраць.

...а кашуля з белага палатна… і прыгожае натыканне на каўняры, каўнерцах, падоле. А для і зімы і непагадзі — белыя ці сівыя кароткія світы. На ногі — ліпавыя, лазовыя ці саламяныя лапці з анучамі, мацаваліся канапляными вітымі аборамі. А летам… а летам дык і босаму добра!..

***

…песні — з'явы падарожжа!

У дарог свая музыка. Вабіць і набліжае далячынь. Музыка дарог сцішае адзіноту. Аблокі натхняюць. Іх пераменлівасць нагадвае зменлівы свет. Ад адной думкі, што чалавецтва, спяшаючыся наперад, можа пакінуць ззаду тое, без чаго потым будзе пуста на перанаселенай планеце, натхняе Вандроўніка. Ёсць рэчы, па якія не вернешся назад, калі не збярэш своечасова… Вандроўнік і сам любіць мяняцца. Скрыжаванні — пачатак шчаслівых хвілін. Засталося быццам мала — авалодаць гэтым светам. Альбо стварыць свой. Вандроўнік — дазвол на свабоду, на ўласнае ўзвышэнне, здольнасць рабіць больш, чым трэба толькі сабе. Вандроўнік вандруе не па свеце, а разам з ім…

***

…для чаго ж у зімні холад
Ты красёнцы лета тчэш…

Якуб Колас

…Вёска тулілася на ўскрайку сусвету. Світы-сярмягі, кажухі, кашулі, спадніцы, фартухі, гарсэты, фальбоны, вышыўкі, аблямоўка зрэзаў верхняга крыса, пройма, гарлавіна, наміткі чапцы, каптуры…

Вёска — дзяржава. Так паўсюдна, так у кожнай вёсцы — з усім сваім: моваю, звычаямі, норавамі і побытам. Кожны — гаспадар, кожная — гаспадыня. *Сам сабе пан, сам сабе служка.* Трэба саха, плуг, серп, калёсы, сані — зробяць!.. Трэба сякера, граблі, піла, каса, лыжка, міска — зробяць! Гаршчок, вядро, дзежка, бочка — зробяць!

На сваёй струне

Ларыса СІМАКОВІЧ, кампазітар

…палойку лёну возьмем, прадзем, снуем, і маўчым. Ані слоўца, ані моўца!.. Напралі, намачылі, патаўклі, высушылі, навілі, укінулі ў ніты, у бёрда, прывязалі і выткалі!.. Калі палатно выраблена — нясуць над галавою, абыходзяць вёску. З трэсак распальваюць вогнішча. І ўсё гэта пад палатном, пад палатном… Праз агонь пераносілі дзяцей, хворых… Потым палатно спальвалі...

Нягневічы, Палхуны, Радута, Занавіны, Лынтупы і Лушчыкі, Курдзекі, Касута… Аздабляюць прыкрынічны крыж толькі на Макавея, адзін раз на год… Кавалкі палатна, ручнікі, стужкі вешаюць вечарам за дзень да Макавея або раніцою ў дзень свята. Абракаюцца круглы год. У Германавічах — крыж-дрэва, у нас — крыж-сонейка, а ў Целяханах — крыж-метка. Крыж-жальнік — у Селяховічах. Крыніцам і прыкрынічным крыжам спавядаліся, ткалі «атносы» — ручнікі такія… Калі якое гора — вешалі ручнікі. Толькі тканыя.

Узоры перабіралі забалаццю... *Тонкія абрусы наткала, мыслямі ўзоры набрала, на свой самадум вышыла.* ...А ў нас ажно тры крыніцы: крыніца пад гарой, крыніца кіпучка (там ключы так білі, вада проста кіпела) і крыніца на балоце. Паставіш на лаўку, да купы свае зямныя прысмакі і адыходзіш. Хто хоча злячыцца, той абракаецца... Павесіш на дрэва ці куст ля крыніцы стужкі, абвяжаш ствалы ручнікамі. «А крыніца, калі не ўзлюбіць каго, пяройдзе на іншае месца!..» ...Крыніца, сцюдзёна вадзіца! Святая панахвідніца ішла з сіняга мора аблокамі, з цёмнага лесу пяскамі, праз сырое карэнне, праз цвярдое каменне...

...Ліха наша, ліха, ідзі за сіне мора! Верабей-пташка, як бы ні было табе цяжка, нясі наша ліха за сіне мора, за белыя хвалі, за далёкія далі… То не бяда, што ў жыце лебяда, няма горшай бяды, як ні жыта, ні лебяды…

***

Канструктыўная адчайнасць. Вандроўнік торыць сцежку. Збірае. Укладае. Выдае. Робіць больш, чым патрэбна для сумленнага жыцця. Робіць за знямоглых, слабых, дэпрэсіўных. Агні не адразу, але запальваюцца. Зоры ўзыходзяць. Навальніцы абуджаюцца. Чысціню вартуюць цёмныя дажджы.

Ён глядзіць на сонца, на свой абшар, на шлях, які прайшоў. Звініць каля скроні скрушная нота. Адзінота — бездакорны шлях узняцца-ўзвысіцца. Трэба трошкі пачакаць — і аднойчы раніцай дзе-небудзь на рагу вуліцы нейкая цудадзейная раса раптам кране яшчэ адно самотнае сэрца…

Трэба трошкі пачакаць — і звон насцярожыць, народзіць жаданне прыслухацца і прыўзняць галаву. І пісьмёны, напісаныя дымам над зімовымі хатамі, выткуць свой касмічны танец. Зачараваны танцам узгадае ромбы-крыжыкі на старых ручніках. Зразумее: створанае — за тваёй спінай. Зношваецца і слабее ўсё. Акрамя творчай сілы. Каб не састарэць самому, трэба быць гэтай сілай.

Касмізм Вандроўніка — раскіданыя па сусвеце сузор'і. Жмені здабытага хараства. Дастаткова кінуць зерне ў ворную зямлю. Узыдзе яно само па сабе. …і без нашага пытання колас вырасце ў раллі…

Чысціня ранішняй расы і радасць бязважкага снегу зберагаюць зялёную рунь. Патанаюць у шчасці быць захаванымі чырвоная ягада, чорны жбан, кужэльнае павуцінне. Шуміць навальніца. Спавядаюцца крыжы. Раздарожжы доўжаць існаванне гэтай загадкавай краіны — краіны Вандроўнікаў...

ВыРАЗНАЯ сімвалічнасць

Новыя і традыцыйныя формы выцінанкі сышліся ў сталічнай галерэі

Вольга Налівайка «Восень».

Здаўна выцінанка ўпрыгожвала хаты нашых бабуль, была неабходным складнікам сялянскага побыту, не страціла сваёй традыцыйнай глебы, пры тым, што цяпер развіваецца і ў новых формах. У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» ў выставачным праекце «Чароўны свет выцінанкі» прадстаўленыя разнастайныя формы беларускай выцінанкі майстрых Галіны Жураўлёвай, Наталлі Клімко, Наталлі Клютко, Вольгі Налівайка і Валянціны Слюнчэнка. Аўтары прыехалі ў Мінск з розных рэгіёнаў Беларусі.

Выстаўка размеркавана ў дзвюх залах. У першай адразу нават складана зразумець, што мы глядзім на выцінанку: узоры, прадстаўленыя ў рамах і пад шклом, нагадваюць жывапісныя творы і раскрываюць сучасныя тэмы, такія як шлюб у розных краінах свету альбо захаванне роднай прыроды. Кожны твор аздоблены сімвалічнымі дэталямі. Другая зала больш традыцыйная: дэманструецца інтэр'ер сялянскай хаты.

— У беларускіх хатах, у асноўным на вёсцы, заўсёды ўпрыгожвалі чырвоны кут — іконай, якая была багата аздоблена выцінанкай, таму што ікона займае самае значнае месца ў хаце, — расказала майстрыха з Івацэвіцкага раёна Наталля Клютко. — Раней вешалі на вокны фіранкі з выразанымі кветкамі, што нагадвалі ручнікі, аздаблялі сцены, хатнія слупы. Фіранкі мянялі ў асноўным да значных свят — на Вялікдзень альбо Раство. Але ж былі і такія майстрыхі, якія маглі мяняць іх кожны тыдзень. Ведаю прыклады, калі і ў нашы дні майстрыхі працягваюць выцінанкай упрыгожваць свае дамы так, як рабілі яшчэ ў сярэдзіне дваццатага стагоддзя. Дарэчы, раней узоры для выцінанак перадаваліся ад бабуль. Сёння ў нас з'явіўся інтэрнэт, можна вывучаць узоры ўсяго свету, што дае магчымасць развіваць нацыянальную выцінанку. На разнастайных фестывалях выцінанкі мы знаёмімся з майстрамі, абменьваемся досведам.

Кожная з аўтараў выстаўкі прыйшла да выцінанкі невыпадкова. Па-першае, як адзначаюць майстрыхі, у іх заўсёды была цікавасць да беларускай культуры і гісторыі. Па-другое, выцінанка насычае станоўчай энергіяй. Па-трэцяе, людзі, якім цікава працаваць рукамі, паспрабаваўшы аднойчы выразаць выцінанку, потым не могуць спыніцца.

Наталля Клютко. Фіранка «Анёлы».

— Аднойчы ад школы, у якой працую, я паехала на курсы павышэння кваліфікацыі. Мне пашчасціла з выкладчыцай Нінай Міхайлавай, якая паказала, як працаваць у тэхніцы выцінанкі, — успамінае Наталля Клютко. — Акрамя беларускай, выкладчык паказвала яшчэ кітайскую тэхніку, адметную тым, што выцінанку там рэжуць вельмі тонка. Беларуская тэхніка таксама прыцягальная. Прыехаўшы дадому, я зрэзала некалькі ўпаковак паперы… Перад тым, як зрабіць першую фіранку, я задумалася: што як жанчына магла б адлюстраваць, які сэнс хацела б укласці. Я звярнулася да беларускага нацыянальнага арнаменту. Першае, што вырашыла выкарыстаць, — сімвал жаночай долі, але з добрым сэнсам. Пасля — сімвал дружнай сям'і і, вядома, сімвал багацця. У сукупнасці фіранка стала нібыта талісманам. А далей пачалі прыходзіць самыя розныя ідэі.

Важна, што сёння цікавасць да выцінанкі з боку аматараў мастацтва ўзрастае. Людзі шукаюць майстроў, у якіх можна зрабіць заказы. Хтосьці прыносіць старыя фотаздымкі, на якіх захаваныя выявы выцінанак, якія былі раней у іх вёсках, хтосьці просіць арыгінальныя ўзоры, каб упрыгожыць імі кватэру, ну, а хтосьці наогул калекцыянуе.

— Цікавасць да выцінанкі павялічваецца, — падкрэсліла Наталля Клютко. — Калі прыязджаем на выстаўкі, зацікаўленыя прыходзяць і ўлюбёна глядзяць на нашыя творы, адразу ўспамінаюць хаты сваіх бабуль, расказваюць, якімі выцінанкамі аздаблялі дамы іх бацькі. Беларускую выцінанку вельмі любяць палякі — ахвотна купляюць яе ў айчынных майстроў. Сёлета на выстаўцы ў Польшчы адна жанчына, якая мае беларускія карані, стаяла дзень і глядзела на маю ікону, пасля спытала цану і пайшла. На наступны дзень вярнулася да мяне і сказала, што вельмі хоча набыць ікону, каб у яе засталася памяць пра продкаў, якія жылі на Гомельшчыне. У той момант я захацела ікону падарыць, але яна ўсё роўна пакінула мне грошы. Цешыць, што творы набываюць ўдумліва.

Выцінанка як кірунак традыцыйнай культуры — нацыянальны брэнд: у гэтай тэхніцы цяпер ствараюцца сапраўдныя творы станковага мастацтва.

Вікторыя АСКЕРА,
фота аўтара



Галіна Жураўлёва «Райскі сад».

Культурны ракурс

Кветкі, Багушэвіч, мядзведзі — адразу ўзгадваюцца прыгожыя вуліцы Смаргоні, цудоўнага гарадка на Гродзеншчыне, які патанае ў квецені...

Францішка Багушэвіча не заўважыць складана: і помнік у цэнтры горада яму ўсталяваны, і рэкламныя постары з яго выявай і наказам: «Не пакідайце ж нашай мовы беларускай, каб не ўмерлі!». Смаргонцы памятаюць і паважаюць славутага земляка, непадалёк ад райцэнтра ёсць мястэчка Кушляны, дзе паэт правёў апошнія гады жыцця.

А яшчэ Смаргонь славіцца мядзведзямі: нездарма ж гэты звер красуецца на гербе горада. Шмат мядзведзяў і ў самім горадзе, напрыклад, у цэнтральным парку іх ажно некалькі: выліты з бронзы разам са сваімі дрэсіроўшчыкамі ды драўляныя. Пацешная мядзведжая сямейка, выраблена з дрэва, нібы магніт, прыцягвае як мясцовую дзятву, так і бывалага вандроўніка.

Яшчэ ў XVII ст. Радзівілы заснавалі ў Смаргоні школу дрэсіроўкі мядзведзяў, якую пазней сталі называць Мядзвежай акадэміяй. Вучыліся мішкі розным трукам ажно шэсць гадоў, быццам у сапраўднай акадэміі! Траплялі сюды жывёлы з навакольных лясоў яшчэ маленькімі, вучыліся, а потым у летні сезон гастралявалі па ўсёй Еўропе. А на зімоўку вярталіся ў альма-матар — гэта была абавязковая ўмова для ўсіх «артыстаў» і іх дрэсіроўшчыкаў. Тут ладзілася спецыяльная лежня, дзе касалапыя адпачывалі ўсю зіму.

Падобныя школы былі і ў іншых краінах Еўропы, але толькі нашы мядзведзі маглі пераймаць паводзіны людзей. Таму і карысталіся смаргонскія «артысты» асаблівай папулярнасцю. Мала хто ведае, што ў смаргонскай акадэміі вучыліся малпы, якія таксама вандравалі па Еўропе. А яшчэ Смаргонь — радзіма абаранкаў. Гэты ласунак першапачаткова быў прызначаны для выхаванцаў акадэміі, а праз нейкі час смак абаранкаў ацанілі і людзі.

Цяпер, магчыма, заснаванне мядзведжай акадэміі падасца сучаснікам незразумелым, нязначным эпізодам з жыцця магнатаў, але гэта наша гісторыя і спадчына.

Марына ПЕТРАШКЕВІЧ

Да ўвагі чытачоў! «ЛіМ» працягвае конкурс «Культурны ракурс». Умовы творчага спаборніцтва змешчаны ў № 2 нашай газеты. Чакаем цікавых і крэатыўных фотаздымкаў з арыгінальным тлумачэннем.

ЛіМ
Выходзіць з 1932 года
16 +
Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь,
грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі»,
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»
Галоўны рэдактар
Ларыса Іванаўна ЦІМОШЫК

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zvyazda.minsk.by
Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by
Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
аддзел «Кніжны свет» — 292-56-53
бухгалтэрыя — 287-18-14
Тэл./факс — 292-20-51

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.
Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ
Тэхнічны рэдактар, камп'ютарная вёрстка:
А. В. Бізункова

Камп'ютарны набор:
А. І. Грамыка
Стыльрэдактар:
Н. А. Святлова
Нумар падпісаны ў друк
28.09.2017 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 1544.
Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013
Заказ — 3369
Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Аўтары паведамляюць прозвішча, імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, месца працы, адрас з індэксам. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
© Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, 2017
© ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі», 2017
© Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"», 2017

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 17039